Родная газета на роднай мове
ЗВЯЗДА
Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.
4 ЛІСТАПАДА 2016 г. ПЯТНІЦА № 214 (28324)
БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

## Свята натхнення

*Удзельнікам і гасцям XXIII Мінскага міжнароднага кінафестывалю «Лістапад»*

*Дарагія сябры!*

Віншую вас з адкрыццём XXIII Мінскага міжнароднага кінафестывалю «Лістапад».

За гады існавання ён стаў аўтарытэтным форумам, які садзейнічае культурнаму ўзаемаўзбагачэнню і папулярызацыі лепшых дасягненняў беларускага і замежнага кінематографа.

Па добрай традыцыі штогод у лістападзе сталіца Беларусі прымае вядомых рэжысёраў, раскрывае гледачу багатую палітру мастацкіх і дакументальных фільмаў з усяго свету. Прадстаўленыя тут работы ўжо атрымалі высокую ацэнку прафесіяналаў і знатакоў кінамастацтва.

Цяперашні фестываль праходзіць у Год культуры, калі асаблівая ўвага дзяржавы прыцягнута да падтрымкі творчых ініцыятыў дзеячаў мастацтва і пошуку перспектыўных маладзёжных праектаў. Перакананы, у гэтым годзе арганізатары парадуюць нас насычанай і разнастайнай праграмай.

Жадаю ўсім удзельнікам і гасцям XXIII Мінскага міжнароднага кінафестывалю «Лістапад» яркіх уражанняў, натхнення і цікавых сустрэч.

**Прэзідэнт Рэспублікі Беларусь Аляксандр ЛУКАШЭНКА.**

## ЦЫТАТА ДНЯ



**Наталля КАЧАНАВА, намеснік прэм'ер-міністра:**

*«У рабоце па прафілактыцы злачыннасці сярод непаўналетніх вельмі важная роля псіхолагаў і сацыяльных педагогаў устаноў адукацыі. Цяпер работу трэба весці індывідуальна, шукаць свой падыход да кожнага дзіцяці. У нашых школах працуюць спецыялісты, якія разумеюць псіхалогію дзіцяці і яе адрозненні, напрыклад, у 7 гадоў і ў 14. Псіхолагі і сацыяльныя педагогі павінны працаваць у цесным кантакце з настаўнікамі і класнымі кіраўнікамі. Педагогі разам павінны прапрацаваць, праясніць сітуацыю, падказаць штосьці бацькам і адкарэкціраваць паводзіны школьніка. Бацькоў трэба інфармаваць не толькі аб праблемах, але і аб тым, што дзіця таленавітае, і якія яго здольнасці трэба развіваць».*

Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 4.11.2016 г.

| | | |
|---|---|---|
| Долар ЗША | 1,9039 | ▼ |
| Еўра | 2,1157 | ▲ |
| Рас. руб. | 0,0299 | ▼ |
| Укр. грыўня | 0,0743 | ▼ |

ISSN 1990 - 763X

# ТВОРЧЫЯ КАНІКУЛЫ



**У маладзёжным цэнтры «Гродна» ў дні школьных канікул размясцілася выстава «100 ідэй для Беларусі». Юныя вынаходнікі маюць магчымасць прадэманстраваць свае распрацоўкі. Напрыклад, Ягор ХІТРУШКА і Уладзіслаў НЕДАЛУГАЎ прадстаўляюць увазе наведвальнікаў выставы кіруемую сонечную панэль.**

Фота БЕЛТА.

■ Лясная гаспадарка

## Не ўсё тое дровы, што гарыць

### Пра драўніну — карысную і непатрэбную

**Кожны раз, палячы грубку ў вясковай хаце, думаю, колькі сухіх дрэў стаіць у лесе, колькі павалу ляжыць, і мару — вось бы гэта сюды. А пасля ўспамінаю, як гэтыя самыя дрэвы масава паляць на ўзлесках і паабапал дарогі. Чаму і навошта? Няўжо нельга прадаваць іх людзям на паліва? З гэтымі пытаннямі я звярнулася да ляснічых і ды камунальнікаў.**

### Ачышчэнне агнём

— Спальванне — гэта адзін са спосабаў ачысткі ўчасткаў, якія выйшлі з-пад высечкі, у прыватнасці пасля буралому. У вогнішча трапляе толькі неліквідная драўніна, якая не мае структуры і праз гэта не можа выкарыстоўвацца як паліва ці тэхналагічная сыравіна для вырабу шчапы або дзелавой драўніны (напрыклад, мэблі), — патлумачыў **Аляксандр МІРАНОВІЧ, дырэктар Бараўлянскага спецлясгаса.** — Груба кажучы, спальваюцца адходы дрэва. Як правіла, гэта верхавіна — галінкі і сучкі дыяметрам менш за 4 см. Больш тоўстыя галіны наразаюцца на паліўную драўніну, якая ў будучым стане дровамі. Забіраць на спальванне галінкі — няма сэнсу. Я здзіўлюся, калі вы мне з сотні чалавек хоць дзясятак знойдзеце, хто захоча паліць імі печ. Цеплаправоднасць паліўнай драўніны атрымліваецца праз яе тэкстуру. А ў галінак — палова драўніны, а палова — абалонка, зялёная сырая частка, дзе праходзіць рух смол і сокаў дрэва. Яна не дасць патрэбнай цеплаправоднасці. Каб абагрэць імі хату, спатрэбіцца дзясяткі ахапкаў галля і паўдня каля грубкі.

Тым не менш леснікі кажуць, што калі ў каго ўзнікне жаданне забраць з лесу галіны — калі ласка. Галоўнае, не прыхапіць разам з галлём ліквідную драўніну, накшталт елкі да Новага года — тады гэта немінучы штраф.

Вогнішчы раскладваюць у зоне да 100 метраў ад дарог. Гэта адначасова і добраўпарадкаванне паабапал трасы, і папярэджванне пажараў на ўзбочынах, напрыклад, праз выкінуты недакурак. Такая адлегласць вызначана тым, што нават калі чалавек проста гуляе па лесе, ён не часта заходзіць у яго глыбей, чым на 100 метраў, адзначае прадстаўнік лясной гаспадаркі.

СТАР. 4

■ Быць у форме

## АЗДАРАВІЦЦА І НЕ РАЗАРЫЦЦА

### Колькі каштуе здаровы лад жыцця ў сталічных спартыўных цэнтрах?



Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

**Модныя часопісы увесь час пішуць пра розныя сродкі, для падтрымання сябе ў добрай форме, навыперадкі расхвальваючы перавагі то аднаго, то другога тыпу заняткаў. І калі шэйпінг, аэробіка і ёга даўно сталі звыклымі, тое, што хаваецца за назвамі стрэчынг, бодзімэйк і кросфіт, для большасці пакуль застаецца загадкай. У тупік ставіць не толькі выбар кірунку, але і месца заняткаў. Чаму аддаць перавагу: дзяржаўнаму або прыватнаму цэнтру? Што важней: камфорт або кошт, а ў ідэале — як гэта сумясціць?**

### Каму пад сілу «падняць» абанемент?

У кожнай з 8 адміністрацыйна-тэрытарыяльных адзінак сталіцы ёсць свой галоўны фізкультурна-аздараўленчы цэнтр, з некалькімі філіяламі ў розных пунктах раёна. Выключэнне складае толькі Савецкі раён, дзе гэтую ролю выконвае прадпрыемства «Фізкультура і здароўе». Паколькі гэтыя ўстановы з'яўляюцца дзяржаўнымі, ключавая задача іх дзейнасці — падтрыманне дзяржаўнай палітыкі ў сферы фізічнай культуры, спорту і турызму. Ахопліваюцца ўсе катэгорыі насельніцтва: ад 4-гадовых малых да пажылых людзей без абмежаванняў па ўзросце. Адзінага пераліку прапанаваных паслуг няма, аднак на выбар у розных варыяцыях прадстаўлены фітнес-кірункі, трэнажорныя залы, танцы, адзінаборствы.

СТАР. 4

## Ад перагавораў — да канкрэтных праектаў

**Завяршылася асноўная перагаворная частка візіту Прэзідэнта Беларусі Аляксандра Лукашэнкі ў Аб'яднаныя Арабскія Эміраты. Аб гэтым паведамляе БЕЛТА са спасылкай на прэс-сакратара кіраўніка беларускай дзяржавы Наталлю Эйсмант.**

Паводле яе слоў, цяпер кіраўнік дзяржавы па запрашэнні эмірацкага боку знаходзіцца ў гасцях у Наследнага прынца Абу-Дабі, намесніка Вярхоўнага галоўнакамандуючага Узброенымі Сіламі ААЭ шэйха Мухамеда бен Заіда аль-Нахаяна.

Плануецца, што заўтра, 5 лістапада, адбудзецца заключная сустрэча Прэзідэнта Беларусі з кіраўніцтвам ААЭ, на якой будуць падведзены першыя вынікі візіту і абмеркаваны канкрэтныя сумесныя праекты, прапрацоўкай якіх бакі займаліся ў гэтыя дні.

## Дзень пісьменства — 2017: на старце

### Полацк рыхтуецца зноў стаць сталіцай свята

**Здаецца, сёлетні Дзень беларускага пісьменства, што традыцыйна прайшоў у пачатку верасня і на гэты раз «гасцяваў» у Рагачове, адбыўся зусім нядаўна. Яшчэ свежыя ўражанні ад сустрэч са старымі і новымі сябрамі, цікавых прэзентацый і прафесійных абмеркаванняў. Але, як кажуць, жыццё не стаіць на месцы, а эстафету ўжо рыхтуецца прыняць самы старажытны горад Беларусі.**

Так, днямі стала вядома, што **створаны аргкамітэт па падрыхтоўцы і правядзенні Дня беларускага пісьменства ў Полацку Віцебскай вобласці 3 верасня 2017 года. Адпаведнае рашэнне змяшчаецца ў пастанове Савета Міністраў ад 1 лістапада 2016 года**. Узначаліла арганізацыйны камітэт намеснік прэм'ер-міністра Наталля Качанава. Намеснікамі старшыні сталі міністр інфармацыі Лілія Ананіч і старшыня Віцебскага аблвыканкама Мікалай Шарстнёў.

Пра тое, з якім настроем палачане ўжо сёння рыхтуюцца да Дня пісьменства, нам расказаў **кіраўнік спраў Полацкага райвыканкама Сяргей ТРУХАНАЎ**:

— Гэта вельмі вялікая падзея для горада, і мы ўсе з нецярплівасцю чакаем свята. Сімвалічна, што чарговы раз прымем гасцей Дня беларускага пісьменства менавіта ў юбілейны год, калі будзе адзначацца 500-годдзе нашага кнігадрукавання. Хацелася б, каб свята запомнілася і палачанам, і гасцям. Спадзяёмся, што і аблічча горада крыху зменіцца, мы зможам адрамантаваць пэўныя аб'екты, надаць новы імпульс развіццю, які будзе падтрыманы і ў будучыні. Варта падкрэсліць: ставімся да свята не проста як да падзеі «на адзін дзень», думаю, што ўвесь 2017 год пройдзе пад знакам беларускага пісьменства. На працягу года ў Полацку будуць адбывацца розныя знакавыя літаратурныя імпрэзы — сімпозіумы пісьменнікаў, сустрэчы з аўтарамі, прэзентацыі новых кніг.

**Марына ВЕСЯЛУХА.**
*vesialuha@zviazda.by*

■ Перспектывы

## ПРАКТЫЧНЫ БОК ІНТЭГРАЦЫІ

### Прэм'ер-міністр з рабочым візітам наведаў Кыргызстан

**Беларусь падтрымлівае ідэю інтэграцыі Еўразійскага эканамічнага саюза (ЕАЭС) і Шанхайскай арганізацыі супрацоўніцтва (ШАС). Пра гэта заявіў учора ў Бішкеку прэм'ер-міністр нашай краіны Андрэй Кабякоў на пасяджэнні Савета кіраўнікоў урадаў краін ШАС. «У часткі эканамічнага ўзаемадзеяння мы цалкам падзяляем ідэю расійскіх партнёраў па цеснай інтэграцыі ЕАЭС і ШАС», — сказаў прэм'ер-міністр.**

Паводле яго слоў, такі падыход падтрымліваецца кіраўніцтвам Беларусі і сугучны з ініцыятывай «інтэграцыі інтэграцый». «Са свайго боку мы падтрымліваем намеры і канкрэтныя планы кітайскіх партнёраў па ўдзеле нашых краін у ініцыятыве эканамічнага пояса Шаўковага шляху, па стварэнні платформаў супрацоўніцтва ў сферы прамысловасці, транспарту і камунікацый, інавацыйнага і фінансавага супрацоўніцтва, інфармацыйных тэхналогій», — дадаў Андрэй Кабякоў. Па яго словах, Беларусь валодае развітым навукова-тэхнічным патэнцыялам для таго, каб зрабіць дастойны ўнёсак у рэалізацыю сумесных праектаў у галіне прамысловасці, інфармацыйна-камунікацыйных тэхналогій, энергетыкі, сельскай гаспадаркі...

Андрэй Кабякоў падкрэсліў, што Беларусь зацікаўлена ў пашырэнні партнёрства з краінамі Шанхайскай арганізацыі супрацоўніцтва. Адным з галоўных прыярытэтаў прэм'ер-міністр назваў вытворчую кааперацыю. «Мы зацікаўлены ў максімальным пашырэнні вытворчай кааперацыі, сярод іншага з улікам наяўнага ў нас вопыту стварэння сумесных прадпрыемстваў на розных кантынентах, — адзначыў Андрэй Кабякоў. — Бачым добрыя магчымасці для кансалідацыі намаганняў па выпуску найноўшых узораў канкурэнтаздольнай машынабудаўнічай прадукцыі, забеспячэнню належнага сэрвіснага і пасляпродажнага абслугоўвання».

Падчас знаходжання ў Бішкеку старшыня ўрада прыняў удзел ва ўрачыстай цырымоніі адкрыцця зборачных вытворчасцей трактароў «Беларус» на базе кыргызскага прадпрыемства «Аўтамаш-Радыятар». Такім чынам, наша краінааднаўляе зборку трактароў у Бішкеку.

Паведамляецца, што зборка будзе ажыццяўляцца на вытворчай плошчы ў дзве тысячы квадратных метраў, 800 з якіх адведзена непасрэдна для зборачнага канвеера, 1 200 метраў вылучаны для складскіх памяшканняў. Праектная магутнасць зборачнай вытворчасці складае да пяці тысяч трактароў у год. Плануецца, што на першым этапе (2017—2018 гады) тут будуць выпускаць да тысячы адзінак тэхнікі. Трактары будуць пастаўляць як на ўнутраны рынак Кыргызстана, так і ў краіны блізкага і далёкага замежжа. У прыватнасці, ужо сёння прапрацоўваецца магчымасць экспарту тэхнікі ў Кітай і Туркменістан.

**Надзея АЛЕКСАНДРОВІЧ**

■

# У віхуры «Лістапада»

## Сёння пачынаецца Мінскі міжнародны кінафестываль

**На цырымоніі адкрыцця XXIII Мінскага міжнароднага кінафестываля «Лістапад», якая адбудзецца ўвечары ў кінатэатры «Масква», у чарговы раз аб штатыў разаб'юць адмысловую талерку, што будзе азначаць афіцыйны старт кінафоруму. Але фармальнасці, хоць і прыгожыя, не так важныя, як «зоркі» «Лістапада» — фільмы. Фестывальныя паказы не будуць чакаць цырымоніі адкрыцця і ўжо сёння пачнуцца ў кінатэатрах «Цэнтральны» і «Мір». Сёлета кінааматарам будзе прадстаўлена больш за 160 самых розных, нечаканых, пяшчотных, ашаламляльных, важных карцін. Сапраўды, «Лістапад» — свята, якое заўсёды з намі.**

Фільм адкрыцця — альманах «Пецярбург. Толькі па любові», што знялі сем рэжысёраў-жанчын, сёння двойчы пакажуць у кінатэатры «Цэнтральны» — на адной з асноўных пляцовак кінафестывалю. Тут жа адбудзецца паказ дакументальнага фільма «Міфунэ. Апошні самурай», які расказвае пра любімага акцёра Акіры Курасавы і ўвогуле легендарную асобу японскага кіно Тасіра Міфунэ. Фільм польскага рэжысёра Ежы Скалімоўскага «11 хвілін», што быў паказаны на Венецыянскім кінафестывалі мінулага года, дапоўніць сённяшні рэпертуар «Цэнтральнага».

У кінатэатры «Мір» пакажуць нашумелую карціну «У промнях сонца» расійскага дакументаліста і прэзідэнта кінафестывалю «Артдокфэст» Віталя Манскага. Гісторыю пра жыццё пхеньянскай сям'і, у якой маленькая дзеці амаль што прысвячаюць сваё жыццё правадыру, здымачная група стварала ў жорсткіх умовах нагляду і цэнзуры. Праўда, Віталь Манскі знайшоў спосабы адлюстраваць больш, чым яму было дазволена. У другі раз здымачную групу ў Паўночную Карэю не пусцілі, але і без гэтых здымак фільм атрымаў шырокі рэзананс — сёння ён будзе паказаны ў «Міры». Карціна «Ольма і Чайка», у якой рэальнасць пераплятаецца з тэатральным вобразам Аркадзінай з чэхаўскай «Чайкі», адзначыўся ў праграме кінафестывалю ў Лакарна, а цяпер дэманструецца ў «Міры».

Сёння ж будзе прадстаўлена журы кінафестывалю, якое стане ацэньваць шэсць конкурсаў «Лістапада» — Асноўны конкурс ігравога кіно, «Маладосць на маршы», Асноўны конкурс дакументальнага кіно, Нацыянальны конкурс, «Лістападзік» і Конкурс нацыянальных кінашкол. Як і раней, гледачы конкурсных паказаў вызначаюць сваю ўзнагароду — «бронзу» «Лістапада» або, можна сказаць, прыз глядацкіх сімпатый. У конкурсы «Лістапада» трапіла 83 работы.

Асноўнымі пляцоўкамі фестывальных паказаў, апроч названых, стануць кінатэатры «Піянер», «Перамога» і Музей гісторыі беларускага кіно. Мерапрыемствы Індустрыяльнай платформы, прызначанай для кантактаў прафесіяналаў кінасферы, будуць праходзіць у галерэі TUT.BY.

Кінафестываль прадоўжыцца да 11 лістапада.

**Ірэна КАЦЯЛОВІЧ.**
*katsyalovich@zviazda.by*




■ Супрацоўніцтва

## З Гомеля — у Казахстан

**Мяса-малочную прадукцыю з Гомельшчыны паспрабуюць спажыўцы ў Казахстане. Падчас міжнароднага інвестыцыйнага форума Ertys Invest 2016, які прайшоў у Паўладары (Казахстан), падпісаны кантракты на $12 млн.**

Прэс-сакратар Гомельскага аблвыканкама Вольга Рабікава расказала, што размова ідзе не толькі пра пастаўкі мясной і малочнай прадукцыі ($10 млн), але і мэблі прадпрыемства «Гомельдрэў» ($2 млн).

У Казахстане працуюць тры дылерскія цэнтры, дзе прадаюць беларускую сельскагаспадарчую тэхніку. Цяпер праведзены перамовы пра пашырэнне зборачнай вытворчасці на сумесным прадпрыемстве ў горадзе Кастанай. Абмяркоўваліся таксама пытанні супрацоўніцтва з гомельскімі прадпрыемствамі ў будаўніцтве жылля і дарог. Падпісаны дамовы аб супрацоўніцтве паміж адміністрацыямі свабодных эканамічных зон «Гомель-Ратон» і «Паўладар», іншыя важныя дакументы.

Афіцыйную дэлегацыю Гомельскай вобласці ўзначальваў старшыня Гомельскага аблвыканкама Уладзімір Дворнік. На пленарным пасяджэнні ён выказаў надзею, што перамовы з удзельнікамі маштабнага з'езду дзелавых людзей стануць чарговым крокам на шляху ўзаемавыгаднага партнёрства, дазволяць вывесці гандлёва-эканамічныя, сацыяльна-культурныя сувязі Гомельшчыны і Казахстана на якасна новы ўзровень.

**Ірына АСТАШКЕВІЧ.** *iost@zviazda.by*

### ПРАМАЯ ЛІНІЯ

### САЦЫЯЛЬНАЯ ДАПАМОГА: ШТО ГАРАНТУЕ ДЗЯРЖАВА?

Трапілі ў цяжкую жыццёвую сітуацыю? Не ведаеце, куды звярнуцца? Хочаце ўдакладніць, ці маеце права на дзяржаўную адрасную сацыяльную дапамогу? А можа, ёсць пытанне наконт дзіцячых дапамог? Альбо трэба даведацца, якія перыяды работы ўваходзяць у страхавы стаж пры назначэнні пенсіі?

Гэтыя і іншыя пытанні вы зможаце задаць на прамой лініі госцю нашай рэдакцыі — **старшыні Камітэта па працы, занятасці і сацыяльнай абароне Мінгарвыканкама Жанне Аляксандраўне РАМАНОВІЧ**. Тэлефануйце 9 лістапада з 10 да 11 гадзін па тэлефоне 8 (017) 287-18-71.

*Папярэднія пытанні можаце даслаць (з пазнакай «Прамая лінія») на электронны адрас info@zviazda.by або па пошце: 220013, г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10а.*

■ Будзь у курсе!

## 7 ЛІСТАПАДА — РУХ ПА ГРАФІКУ НЯДЗЕЛІ

Дзяржаўнае прадпрыемства «Мінсктранс» праінфармавала, што рух аўтобусаў па міжгародных маршрутах, што абслугоўваюцца ім, у перыяд з 4 па 7 лістапада будзе арганізаваны па наступных графіках з улікам змены працы маршрутаў, што будуць адпраўляцца ад АВ «Цэнтральны» (з якім можна азнаёміцца на сайце прадпрыемства): 4 лістапада — па графіках пятніц, 5 лістапада — субот, 6 лістапада — будных дзён (серад), 7 лістапада — па графіках нядзельных дзён.

## ДЗЯЛЯНКІ ДЛЯ НАШЧАДКАЎ

**Падведзены вынікі добраахвотнай акцыі «Адновім лясы разам!», якая па ініцыятыве Міністэрства лясной гаспадаркі праходзіла ў краіне цягам больш чым трох тыдняў.**

Яе падтрымалі больш за 5,3 тысячы неравнадушных грамадзян, якія прынялі ўдзел у пасадках лесу на тэрыторыях, што былі пашкоджаны ўраганымі ветрамі летам. Агульнымі намаганнямі добраахвотнікаў — студэнтаў, валанцёраў, работнікаў шэрагу міністэрстваў і ведамстваў, прадпрыемстваў і арганізацый, а таксама вайскоўцаў — было пасаджана 3,5 тысячы гектараў новых лясоў.

**Сяргей РАСОЛЬКА.** *rs@zviazda.by*

■

■ Сітуацыя

# ЦЫКЛОН ПРАСПАЛІ

**Старшыня Мінаблвыканкама Сямён ШАПІРА застаўся незадаволеным расчысткай дарог пасля снегападу, які прайшоў ноччу з 1 на 2 лістапада. З гэтай нагоды ён правёў нараду ў рэжыме анлайн са старшынямі райвыканкамаў, кіраўнікамі дарожных і камунальных службаў, абласнога ўпраўлення дзяржаўнай аўтаінспекцыі.**


Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

У выніку цыклона Gisi на дарогах цэнтральнага рэгіёна зарэгістраваны 43 аварыі. На шчасце, ахвяр няма.

— Сіноптыкі папярэджвалі, што рухаецца цыклон са снегам, яшчэ тыдзень назад. А вы праспалі. У мінулым годзе мы дамовіліся: калі дзесьці на дарогах ствараецца крытычная сітуацыя, у 2-3 гадзіны ночы без прамаруджвання падымаць любую колькасць тэхнікі, каб забяспечыць нармальны рух, захаваць жыццё і здароўе нашых грамадзян, — адзначыў Сямён Шапіра. — Прычым летась быў выпрацаваны адпаведны механізм дзеянняў у пазаштатных сітуацыях.

Кіраўнік цэнтральнага рэгіёна запатрабаваў далажыць аб тым, дзе тэхніка не прыступіла своечасова да расчысткі дарог: «Старшыні райвыканкамаў — гэта гаспадары ў сваім рэгіёне. Яны абавязаны ў складаных умовах надвор'я паставіць пад ружжо ўсе службы, незалежна ад таго, якога значэння дарога — рэспубліканскага, абласнога або мясцовага. Неабходна адклікаць з адпачынку супрацоўнікаў ДАІ, забяспечыць кантроль на дарогах за захаваннем хуткаснага рэжыму, асаблівую ўвагу звяртаць на стан шын, арганізаваць падсыпку пясчана-салянай сумессю дарожнага пакрыцця».

Сямён Шапіра запатрабаваў пакласці яму на стол зводку ўсіх дарожна-транспартных здарэнняў. Тыя, што адбыліся не па віне вадзіцеля, павінны быць аплачаны з кішэняў кіраўнікоў дарожных арганізацый, ДАІ і старшынь райвыканкамаў. Старшыня аблвыканкама звярнуў увагу на тое, што супрацоўнікі аўтаінспекцыі павінны займацца перш за ўсё справай, а не аддаваць яму чэсць, калі прыедзе ў раён. «Мне не трэба паказухі. Вы павінны адказваць перш за ўсё за жыццё і бяспеку ўдзельнікаў дарожнага руху», — сказаў ён.

Старшыня аблвыканкама не выключыў, што пасля адпаведнага аналізу, магчыма, вінаватыя пазбавяцца сваіх пасад.

**Таццяна ЛАЗОЎСКАЯ.**
lazovskaya@zviazda.by

■ Надвор'е

# Падмарозіць і стане слізка

## У выхадныя на поўначы чакаецца нават да мінус 10 градусаў, а ўдзень — моцныя ападкі

**Напрыканцы першага тыдня лістапада на тэрыторыі краіны прагназуецца снег, мокры снег і дождж, паведамляе галоўны сіноптык службы гідраметэаралагічных прагнозаў Рэспубліканскага цэнтра па гідраметэаралогіі, кантролі радыеактыўнага забруджвання і маніторынгу навакольнага асяроддзя Мінпрыроды Святлана РЫБАКОВА.**

Сёлета позняя восень увогуле багатая на сюрпрызы, калі на паўночным усходзе назіраліся сур'ёзныя снегапады, а вышыня снежнага покрыва дасягала 10—15 см. Потым, пры дзённых станоўчых тэмпературах снег паціху сыходзіў. Такі сінаптычны сцэнарый захаваецца і надалей. У пятніцу на большай частцы тэрыторыі пройдзе кароткачасовы снег, мокры снег. На асобных участках дарог чакаецца галалёдзіца. Максімальная тэмпература паветра ўдзень складзе ад мінус 2 градусаў на паўночным усходзе да 4 цяпла на паўднёвым захадзе краіны.

Далей сіноптыкі чакаюць увогуле нестабільнае надвор'е. У суботу ўначы ў асобных раёнах, а ўдзень — на большай частцы тэрыторыі Беларусі пройдзе кароткачасовы снег, мокры снег, па паўднёвым захадзе ўдзень снег пяройдзе ў дождж. У асобных раёнах чакаецца слабы галалёд, на дарогах — галалёдзіца. Зусім некамфортна стане тады, калі на фоне ападкаў пачне падмарожваць. Тэмпература паветра ўначы апусціцца да нуля — мінус 7 градусаў, па поўначы пры праясненнях трэба чакаць нават да 10 марозу. Удзень будзе не намнога лепш, чакаецца ад мінус 3 градусаў па паўночным усходзе да плюс 6 градусаў па паўднёвым захадзе.

А ў нядзелю на тэрыторыю краіны завітае чарговы цыклон з боку Заходняй Еўропы. Удзень у асобных раёнах сіноптыкі прагназуюць моцныя снегапады і дажджы, наліпанне мокрага снегу. Уначы і раніцай магчымы слабы галалёд, на дарогах галалёдзіца. Цыклон прынясе невялікае пацяпленне, калі мінімальная тэмпература паветра ўначы будзе вагацца ад мінус 3 да плюс 3 градусаў, па поўначы — да 6 марозу. Удзень чакаецца 1—6 цяпла. На поўдні ў нядзелю будзе ўвогуле цёпла, уначы чакаецца 4—5 цяпла, удзень — ад плюс 7 да плюс 10 градусаў.

Паводле папярэдніх прагнозаў айчынных спецыялістаў, даволі складаныя ўмовы надвор'я чакаюцца і на старце наступнага тыдня. У панядзелак паўднёвы цыклон прынясе да нас парывісты вецер і моцныя ападкі. Тэмпература паветра ўначы складзе ад мінус 2 да плюс 5 градусаў, удзень — ад нуля да 7 цяпла, а па поўдні — да плюс 9 градусаў. Амаль паўсюдна чакаецца мокры снег і дождж у аўторак. Тэмпература паветра ўначы складзе ад мінус 3 да плюс 4 градусаў, удзень — 1—7 цяпла, а па поўначы ўдзень — ад нуля да мінус 2 градусаў. У сераду стане яшчэ халадней. Тэмпература паветра ўначы будзе вагацца ад нуля да мінус 7 градусаў, пры праясненнях па поўначы краіны — да 10 марозу. Даволі няўтульна прагназуецца і ўдзень, калі чакаецца ад мінус 4 да плюс 3 градусаў. Такая вось «маладая зіма» ў лістападзе.

**Сяргей КУРКАЧ.** kurkach@zviazda.by

■ За падзеяй

# ЯКУБ КОЛАС: ВЯДОМЫ І НЕВЯДОМЫ

## Новыя факты пра жыццё і творчасць класіка адкрываюцца на «Каласавінах»

**Святкаваць дні нараджэння любімых пісьменнікаў можна па-рознаму. А вось прыхільнікі творчасці народнага паэта Беларусі Якуба Коласа дакладна ведаюць: кожны год 3 лістапада, у дзень яго нараджэння, усіх чакаюць у гасцінным доме класіка, які зараз з'яўляецца Дзяржаўным літаратурна-мемарыяльным музеем. А на наступны дзень уся вялікая каманда па традыцыі рушыць на Стаўбцоўшчыну, каб наведаць родныя мясціны творцы. Свята, што атрымала сімвалічную назву «Каласавіны», стала сапраўды агульным, сёлета яно праходзіць вось ужо 30-ы раз.**


Фота Кастуся ДРОБАВА.

Успамінамі пра сустрэчу з Якубам Коласам дзеліцца скульптар Леў ГУМІЛЕЎСКІ.

— Кожныя з нашых «Каласавін» пакідаюць свой след у даследаванні творчай спадчыны народнага паэта, — кажа **дырэктар літаратурна-мемарыяльнага музея Якуба Коласа Зінаіда КАМАРОЎСКАЯ**. — Здавалася б, што можна новага знаходзіць на працягу трох дзесяцігоддзяў такой вялікай колькасці даследчыкаў! Аказваецца, можна. Творчасць Коласа, яго жыццёвая дарога невычарпальныя, у іх адкрываюцца ўсё новыя і новыя штрыхі, факты, рысы. Сімвалічна, што кожныя «Каласавіны» як магнітам прыцягваюць у музей новыя матэрыялы, адкрыцці, прадметы. Летась такім адкрыццём сталі лісты Коласа да Аляксея Новікава-Прыбоя, а літаральна сёння нам прынеслі ўнікальныя тканыя посцілкі са Стаўбцоўшчыны. Яны датуюцца канцом XIX — пачаткам XX стагоддзя.

Даследаванне творчага і жыццёвага шляху пісьменнікаў часам падобнае на сапраўдны дэтэктыў. Вось і падчас «Каласавін» успаміны аднаго з удзельнікаў свята дапамаглі скласці пазл ходу апошняга дня Якуба Коласа. Так, **скульптар, народны мастак Беларусі Леў ГУМІЛЕЎСКІ** расказаў, што бачыў класіка... за дзве гадзіны да яго смерці.


Васіль Ткачук. «Якуб Колас». Папера, літаграфія. (Работа перададзена сёлета ўнучкай мастака ў падарунак Каласаўскаму музею.)

— Я ішоў па Круглай плошчы — зараз плошча Перамогі ў сталіцы. Кіраваўся ў інстытут — я тады працаваў на першым курсе, — успамінае скульптар. — Убачыў, як да гастранома пад'ехала машына «Победа». Выйшаў Колас, зайшоў у краму... Калі я вярнуўся дадому з заняткаў, то ўжо стала вядома, што паэт памёр.

Даследчыкі біяграфіі Якуба Коласа пацвердзілі: у той дзень паэт мог заехаць у краму, каб купіць цукеркі ў падарунак сваёй унучцы Машы на дзень нараджэння. Памятная сустрэча пакінула моцнае ўражанне ў свядомасці Льва Гумілеўскага, ён стварыў эскіз скульптурнага партрэта Якуба Коласа з сімвалічнай назвай «Пісьмо ў ЦК. 13 жніўня, 1956 год» (вядома, што ў апошні дзень свайго жыцця класік хадзіў у ЦК з лістом аб стане беларускай мовы).

Учора, падчас «Каласавін», навукоўцы розных пакаленняў шмат разважалі пра адметнасці творчасці Якуба Коласа, дзяліліся сваімі адкрыццямі і знаходкамі. А таксама — выказвалі прапановы. Так, неаднаразова гучала ідэя аб стварэнні персанальнай энцыклапедыі «Якуб Колас». Думку выказаў **доктар філалагічных навук, член-карэспандэнт НАН Беларусі Міхась МУШЫНСКІ**. Шаноўны даследчык зазначыў, што выхад такога выдання быў бы надзвычай сімвалічным і своечасовым да 135-годдзя класіка, якое мы будзем святкаваць налета.

**Марына ВЕСЯЛУХА.**
vesialuha@zviazda.by

■ Ад задумы — да ўвасаблення

# ІДЭІ, ЯКІЯ ЗМЕНЯЦЬ НАША З ВАМІ ЖЫЦЦЁ

## Сантэхнік Пятровіч вас больш не патурбуе

**Стартап-школа Інстытута бізнесу і менеджменту тэхналогій БДУ адкрылася ў Мінску. Яе мэта — навучыць беларусаў запускаць уласны бізнес.**




— Школа прызначана, па-першае, для людзей, у якіх ёсць якая-небудзь бізнес-ідэя, але няма каманды для яе рэалізацыі. Па-другое, для спецыялістаў, якія шукаюць ідэю і жадаюць папрацаваць у камандзе, — тлумачыць **кіраўнік стартап-школы Радыён МАРОЗАЎ**. — Мы жадаем аб'яднаць такіх людзей і з дапамогай нашых экспертаў і ментараў дапамагчы бізнес-ідэям эвалюцыянаваць у зразумелую бізнес-мадэль.

У пачатку наступнага года ў стартап-школе распачынаецца інтэнсіў «Стартап за 9,5 тыдня». Усяго за два з паловай месяцы камандам трэба будзе засвоіць тэхналогію запуску бізнесу, спраектаваць свой стартап, упакаваць прадукт і, магчыма, зарабіць першыя грошы. А да канца бягучага года будуць праходзіць мітапы — сустрэчы, дзе ў кожнага ўдзельніка будзе дзве хвіліны, каб прадставіць сваю ідэю ці праект або сябе «прарэкламаваць» — расказаць усім пра свае кампетэнцыі.

На адкрыцці стартап-школы было прадстаўлена шмат ідэй, якія могуць кардынальна змяніць наша жыццё, калі ўвасобяцца ў рэчаіснасць. Мы адарвёмся ад камп'ютараў і, нарэшце, зоймемся спортам. Дадатак з эфектам а-ля Pokemon Go зменіць ход эвалюцыі і пераўтворыць згорбленых малпаў зноў у людзей. Назаўсёды знікне «сантэхнік Пятровіч», які рамантуе кран толькі з дзясятай спробы. Спецыяльны вэб-сэрвіс дапаможа абараніць заказчыка ад непрафесіяналаў і тых, хто «накручвае» на паслугах па рамонце жылля.

Дастаткова будзе запоўніць усяго адну анлайн-форму і ўказаць свае перавагі і бюджэт, каб атрымаць адпаведныя прапановы адразу ад усіх турыстычных фірм на свой мабільнік.

Зменіцца аблічча нашых гарадоў. Пяціпавярховікі пасля капітальнага рамонту стануць сяміпавярховікамі, прычым у пентхаусах размесцяцца трэнажорныя залы, буцікі і офісы. Такія тэхналогіі ў заходніх краінах ужо ёсць, але і беларускім інаватарам ёсць што прапанаваць.

Усе заняткі стартап-школы будуць праводзіцца Інстытутам бізнесу і менеджменту тэхналогій БДУ ў партнёрстве з грамадскім аб'яднаннем «Таварыства садзейнічання інавацыйнаму бізнесу». Экспертамі ў школе выступяць паспяховыя беларускія бізнесмены.

**Надзея НІКАЛАЕВА.**
nikalaeva@zviazda.by

# НЕ ЎСЁ ТОЕ ДРОВЫ, ШТО ГАРЫЦЬ

## Карысны попел і лоўчая драўніна

Унутры лясных масіваў (глыбей за 100 метраў ад дарогі) спальваюцца толькі дрэвы, якія заражаны хваробай або шкоднікамі. Складзіраванне такіх экзэмпляраў у лесе небяспечна для іншай расліннасці і распаўсюджвае заразу. Паліцца, у прыватнасці, лоўчая драўніна, якую спецыяльна выкладваюць у лесе, каб насякомыя засялялі яе лічынкамі і не псавалі іншыя дрэвы, робячы з іх рассаднікі хвароб.

**Падчас летняга ўрагану толькі на тэрыторыі Бараўлянскага спецлясгаса цалкам загінула каля 600 га лесу, якія поўнасцю высечаныя. Месцаў, дзе бурай дрэвы пашкоджаны не скрозь, — каля 5000 га. На гэтых тэрыторыях асобна стаячыя дрэвы пакідаюць на месцы.**

— Спальванне не шкодзіць лесу, бо рэчывы з попелу нейтралізуюць глебу, асабліва з павышанай кіслотнасцю, — расказаў дырэктар лясгаса. — Калі на такой глебе высечкі лес, то там пачнуць расці крапіва, сніткі і нават баршчэўнік. На нейтральнай глебе гэтаму зеллю сілкавацца і расці складаней. Акрамя таго, на месцах былых

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)



Фота Надзеі БУЖАН.

вогнішчаў цудоўна аднаўляецца бяроза, насенне якой прарастае проста скрозь попел. Пачынае расці і асіна, хоць яе далучаюць да пустазеллевых раслін, бо яна глушыць больш каштоўныя пароды дрэў.

Утылізуюць неліквідную драўніну (высякальныя рэшткі) не толькі ў вогнішчах. Часта фрагменты дрэў драбняць і раскідваюць па лесе — з гэтага пазней фарміруецца пладаносны слой. Там, дзе лес высякаецца выбарачна, драўніну складваюць у кучкі, і пасля перагнівання яна таксама становіцца карысным рэчывам для глебы і будучай расліннасці.

— Калі ўтылізацыя суцэльная, як пасля буралому, узбоч дарогі драўняныя адходы складваюцца ў валы. Пазней глеба паміж імі мінералізуецца, што спрыяе штучнаму стварэнню лясных культур. А неліквідная драўніна вала ў працэсе гніення становіцца складам карысных рэчываў для будучых раслін, — дадаў Аляксандр Мірановіч.

Карані часцей за ўсё не спальваюць, а складваюць у валы. Тым больш што іх, як правіла, і не выкарчоўваюць. Выключэнне толькі для дрэў, якія павыварочвала з каранямі. Зрэдку бывае, што калі вогнішча распальваюць каля пня, ён можа натуральным чынам абгарэць. Пні хвойных парод дрэў, што маюць большую цеплаправоднасць смол, можна скарыстоўваць для перапрацоўкі ў шчапу. Атрымаецца яна і з каранёў, аднак настолькі дробная, што будзе не гарэць, а тлець.

## У кастрах спальваюць грошы?!

Работнікі жыллёва-камунальнай гаспадаркі таксама сутыкаюцца з драўнянымі адходамі. Гэта і галіны, якія ўвосень і ўвясну яны абразаюць з дрэў на прыдамавых тэрыторыях, і цэлыя дрэвы і кусты, якія высякаюцца па заяўках жыхароў, калі яны занадта разрасліся і зацяняюць вокны.

Праўда, спальваць гэта, па сутнасці, смецце ў мяжы горада яны не могуць. На звалку яго таксама не здасі, як і не прадасі жыхарам на дровы, бо ЖКГ можа рэалізоўваць толькі паслугі з матэрыялу, а не сам матэрыял. Камунальнікі заключаюць дагавор на ўтылізацыю сыравіны з перапрацоўчымі арганізацыямі і мяркуюць, што распарадзіцца драўнінай можна больш па-гаспадарску.

— Мы асобна здаём галіны, пасечаныя па 50 см, і асобна бярвенні. Пры гэтым яшчэ і плацім грошы спецпрадпрыемству за перапрацоўку. А яно пасля атрымлівае яшчэ і прыбытак ад продажу шчапы і іншых прадуктаў, у якія ператвараецца драўніна. Гэта рэальныя грошы, — разважае **Павел ТУМІЛОВІЧ, намеснік дырэктара ЖЭУ № 4 Заводскага раёна г. Мінска.** — Мне здаецца, лепш здаваць усе часткі дрэў на ўтылізацыю, нават маленькія галінкі перарабляць на шчапу, а не спальваць іх. Гэта ж тое самае, што ў вогнішчы на ўскрайку лесу паліць грошы. Калі пасля спальвання застаецца карысны попел, значыць там было чаму гарэць, хіба не? З трухі ж попел не ствараецца — значыць, гэта была нармальная «жывая» драўніна, якую можна было б адправіць на перапрацоўку. Тым больш што на базе лясных гаспадарак зусім іншыя аб'ёмы драўняных адходаў. А тымі ж хворымі дрэвамі з жучкамі можна было б у печы паліць, а не вуліцу апальваць.

— Мы гатовыя самі перарабляць у шчапу неліквідную драўніну, калі ЖКГ будзе купляць яе і зможа скарыстоўваць для ацяплення. Кошт такога прадукту самога па сабе нулявы, бо яна не будзе гарэць. А для яе стварэння патрэбны затраты на работу абсталявання, зарплату трактарысту, што адвязе шчапу, ды іншае, — адказаў на гэта прадстаўнік лясной гаспадаркі.

### Ці можна купіць дровы?

Як правіла, многія лясгасы прадаюць дрэвы толькі ў выглядзе бярвенняў. 87—95 рублёў за м³ у залежнасці ад пароды каштуюць напілаваныя па 1—2 метры ў даўжыню дрэвы, якія самастойна прыйдзецца забіраць з лясной дзялянкі недалёка ад сталіцы. Выкладзеныя ў штабелі ўздоўж дарогі бярвенні даўжынёй па 4 метры абыдуцца ў 165 рублёў за м³. Дастаўка драўнянага матэрыялу на падворак разлічваецца індывідуальна ў залежнасці ад кіламетражу.

Колатыя дровы нарыхтоўшчыкі прадаюць за 45 рублёў за м³ (дуб, ясень), 43 — граб, 40 — клён, 38 рублёў — бяроза, алешына, таполя, 35 — елка і іншыя. (Праўда, у розных кампаній магчымая розніца ў цане да дзесяці, а то і больш рублёў за м³.) Аднак самае галоўнае — купляючы дровы, звяртайце ўвагу на тое, як прадаецца той самы «куб»: навалам ці шчыльна ўкладзеным. Апошні варыянт удвая даражэйшы, аднак вы атрымаеце столькі дроў, колькі заказалі. Прывезеныя ж навалам, скажам, 10 м³ дроў, акуратна складзеныя, ператворацца ў 5 м³.

Ірына СІДАРОК.
sidarok@zviazda.by

# АЗДАРАВІЦЦА І НЕ РАЗАРЫЦЦА

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

За адзін абанемент кошт у цэлым прымальны (досыць выключыць з рацыёну шкодныя, часта нятанныя перакусы — і грошы знойдуцца), а вось «пацягнуць» 2 і больш кірункаў у месяц не кожнаму пад сілу. Напрыклад, адзін занятак працягласцю ў гадзіну ў трэнажорнай зале ў Партызанскім фізкультурна-аздараўленчым цэнтры абыдзецца ў 5 рублёў, абанемент на 8 заняткаў — 38 рублёў. Для студэнтаў прадугледжана зніжка — 4,5 і 28 рублёў адпаведна. На адмысловым рахунку школьнікі і асобы з абмежаванымі фізічнымі магчымасцямі: яны могуць працаваць над сваім целам у зале бясплатна. У Фрунзенскім фізкультурна-аздараўленчым цэнтры сістэма падліку кошту крыху іншая: ён залежыць ад часу наведвання. Шчасліўчыкам, якія могуць займацца ў трэнажорнай зале да 17 гадзін, удасца сэканоміць. Так, разавы занятак да «часу Х» абыдзецца ў 6 рублёў, пасля — у 7,5. Дарэчы, тут аматарам спорту давядзецца напружвацца не гадзіну, а ўсе паўтары. Абанемент на 8 заняткаў — 32 і 42 рублі ізноў жа ў залежнасці ад часу. Спецыяльныя цэны для школьнікаў, студэнтаў і інвалідаў дзейнічаюць у будныя дні да 17 гадзін: 5 рублёў занятак і 26 — абанемент.

Зараз завяршаецца ўзвядзенне фізкультурна-аздараўленчага цэнтра ў Малінаўцы. А на наступны год запланаваны пачатак будаўніцтва спартыўнага комплексу ў Лошыцы.

Што да прыватных трэнажорных залаў і спартыўных цэнтраў, то яны з'яўляюцца на карце горада і знікаюць з рэгулярнасцю, якой могуць пазайздросціць іх не самыя добрасумленныя наведвальнікі. Колькі разоў пачаткоўцы-спартсмены з расчараваннем, да якога дамешвалася значная доля палягчэння, выяўлялі, што як толькі яны сабраліся з сіламі, каб прывесці сябе ў парадак, клуб побач з домам перазаджаў у іншае месца або зусім пераставаў існаваць. І гэта не дзіўна, бо з-за велізарнай колькасці прапаноў канкурэнцыя ў гэтай сферы сапраўды сур'ёзная. Выкручваецца хто як можа. Некаторыя цэнтры, напрыклад, прапануюць абанементы на паўгода і нават на год пад умоўным лозунгам «оптам танней». Так можна знайсці купон на 100 заняткаў за 320 рублёў, што адпавядае суме 27 рублёў штомесяц. Падобную акцыю падтрымлівае і Партызанскі фізкультурна-аздараўленчы цэнтр, аднак не для льготнікаў гэта абыдзецца ў 575 рублёў, затое колькасць заняткаў не абмежавана. З аднаго боку, сэканоміць сапраўды можна, але з другога — імавернасць, што ва ўсіх, хто набудзе абанемент такога тыпу, хопіць вытрымкі дайсці да канца, — вельмі малая.

**Зараз завяршаецца ўзвядзенне фізкультурна-аздараўленчага цэнтра ў Малінаўцы. А на наступны год запланаваны пачатак будаўніцтва спартыўнага комплексу ў Лошыцы.**

Сярод прыватных цэнтраў ёсць асаблівы тып устаноў, якія арыентаваны на высокія запыты: за задавальненне пазаймацца «ў інтэр'еры, выкананым у модным стылі лофт», разглядаючы пейзаж у панарамныя вокны, прыйдзецца выкласці да 20 рублёў за разавы занятак. І гэта яшчэ без паслуг трэнера...

## Не заплыць «за буйкі» разумных цэн

Нароўні з сілавымі трэніроўкамі велізарнай папулярнасцю карыстаюцца «водныя працэдуры». І калі лазні і саўны не заўсёды прымяняюцца выключна ў аздараўленчых мэтах, то басейнам аддаюць перавагу сапраўдныя прыхільнікі здаровага ладу жыцця. Паколькі колькасць аматараў паплаваць год ад года, хоць і пад уздзеяннем мас-медыя, але ўсё ж павялічваецца, не так даўно паўстала праблема: «блакітных дарожак» вельмі не хапае. У сувязі з гэтым было прынята рашэнне дадаткова ўзвесці па тыпавому басейну ў кожным раёне сталіцы. Будаўніцтва першага з іх — у мікрараёне Брылевічы — ужо вядзецца. Здача яго ў эксплуатацыю запланавана на лета наступнага года.

Тыпавы праект, рэалізацыя якога патрабуе мінімальных з магчымых выдаткаў, прадугледжвае наяўнасць у будынку двух басейнаў: умоўна, дарослага і дзіцячага, з прапускной здольнасцю 70 чалавек у гадзіну.

Што тычыцца коштаў, то разавы занятак у басейне працягласцю 45 хвілін у фізкультурна-аздараўленчым цэнтры «Серабранка» для дарослага абыдзецца ў 7 рублёў да 17 гадзін і ў 9 — пасля, абанемент на месяц — 50 і 65 рублёў адпаведна. Калі зірнуць на цэны за навучанне (для дарослага — 15 рублёў занятак), міжволі пачынаеш задумвацца, што спосаб «кінуць у ваду», дзякуючы якому многія за хвіліну навучыліся плаваць, а дакладней, выжываць, не такі ўжо і дрэнны. Хоць, магчыма, высокі кошт сведчыць пра тое, што ўсё трэба рабіць своечасова: для дзяцей да 16 гадоў адзін такі занятак абыдзецца ў 8 рублёў. Дарэчы, многія прадпрыемствы і кампаніі з мэтай развіцця ў сваіх работніках схільнасці да здаровага ладу жыцця пакрываюць выдаткі на абанементы ў спартыўныя цэнтры.

## Не толькі ў пастцы: на якія заняткі можна трапіць бясплатна?

Акрамя вялікага пераліку платных секцый — ад стрып-пластыкі да скалалажання — раённыя фізкультурна-аздараўленчыя цэнтры прапануюць далучыцца да спорту на бясплатнай аснове. Напрыклад, жыхары Кастрычніцкага раёна сталіцы могуць паспрабаваць сябе ў скандынаўскай хадзе — гэта адмысловая тэхніка, для якой неабходны спецыяльныя палкі. Кірунак атрымаў



Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

шырокае распаўсюджанне ў Еўропе, асабліва сярод пажылых людзей. А ў Цэнтральным раёне асобам пенсійнага ўзросту даступны бясплатныя заняткі ў фітнес-цэнтры.

Для дарослых наведвальнікаў фізкультурна-аздараўленчага цэнтра «Маскоўскі» арганізаваны секцыі па валейболе і гіравым спорце. Дзеці, акрамя гэтых кірункаў, могуць запісацца на футбол, хакей, баскетбол, а таксама шахматы і шашкі. У Фрунзенскім раёне спіс бясплатных заняткаў для дзяцей і падлеткаў увогуле велізарны: паўэрліфтынг, дзюдо, стрытбол, біятлон, канькабежны спорт... І гэта яшчэ далёка не ўсё. На некаторыя, напрыклад акрабатыку і гімнастыку, можна хадзіць пачынаючы з 4 гадоў.

Як адзначыла **намеснік начальніка ўпраўлення спорту і турызму Мінгарвыканкама Святлана ДЗЯМЕШКА**, цэны на заняткі ў фізкультурна-аздараўленчых цэнтрах фарміруюцца па сістэме, замацаванай заканадаўча. Акрамя таго, ёсць катэгорыі грамадзян, якім паслугі прапаноўваюцца бясплатна. Напрыклад, інваліды 1 групы. У астатнім, тое, на якія кірункі і каму даюцца зніжкі або магчымасць наведваць іх бясплатна, кожны фізкультурна-аздараўленчы цэнтр вызначае самастойна. Інфраструктура горада актыўна развіваецца ў гэтым напрамку: на працягу мінулага і бягучага года ў сталіцы ў дзеянне былі ўведзены басейн БНТУ, спартыўна-аздараўленчы комплекс «Фрыстайл», спартыўны комплекс футбольнага клуба «Мінск», фізкультурна-аздараўленчы комплекс «Мандарын», стадыён «Арбіта», Парк экстрымальных відаў спорту. У планах на найбліжэйшае пяцігоддзе — рэканструкцыя стадыёнаў «Дынама» і «Трактар» і будаўніцтва нацыянальнага футбольнага стадыёна. Асаблівая цікавасць мінчан да плавання і веласпорту таксама знойдзе адлюстраванне на карце горада. Па даных мінулага года ўсяго сістэматычна практыкуюцца ў розных фізкультурных кірунках каля 452 тысяч жыхароў сталіцы.

У цэлым, цэны на заняткі ў спартыўных цэнтрах мізэрнымі назваць нельга. Аднак, нават пры сціснутым бюджэце, выхад ёсць: можна старацца наведваць іх у больш ранні час, купляць абанементы на працяглы тэрмін, сачыць за акцыямі ці ўвогуле запісацца на бясплатныя секцыі. Гэта менавіта той выпадак, калі ж нельга больш да месца падыходзіць фраза: «Хто хоча, шукае магчымасці, а хто не хоча — прычыны»...

Дар'я КАСКО. kasko@zviazda.by

Крысціна СМОЛЬСКАЯ:

# «Сучаснае мастацтва — гэта спосаб змяніць сябе»



**Актыўна працуе ў галіне тэатральнай крытыкі. Заканчвае навуковую кнігу пра сучасную беларускую драматургію і тэатр. Кіруе літаратурна-драматычнай часткай Горкаўскага тэатра. Выкладае на тэатральным факультэце Акадэміі мастацтваў. А яшчэ — з'яўляецца тэлевядучай канала «Беларусь 3». Сама наша гераіня, кандыдат мастацтвазнаўства Крысціна СМОЛЬСКАЯ ў такім спалучэнні роляў не бачыць аніякіх парадоксаў. Галоўнае — з любоўю і цікавасцю ставіцца да кожнага з заняткаў. Пра сакрэты адкрытай гутаркі з зусім незнаёмымі людзьмі, інтарэсы «за кадрам» і закулісныя гісторыі праграмы «Дыя@блог пра прыгожае» мы сёння і гутарым з Крысцінай.**

— Мне падаецца, спецыфіка праграмы патрабуе, каб у якасці яе вядучага выступаў чалавек адукаваны, які цікавіцца светам і людзьмі. У рабоце на тэлебачанні мне найбольш падабаецца тое, што гасцямі становяцца цікавыя людзі, з якімі можна паразмаўляць. І ў цэлым, што можа быць цікавейшым, чым чалавек і свет?

***— Праграма мае назву «Дыя@блог пра прыгожае», і паняцце «прыгожае» гучыць досыць абстрактна. Што маецца на ўвазе?***

— Усе прыгожыя мастацтвы — музыка, тэатр, кіно, жывапіс, мода, скульптура, фатаграфія, дызайн, вулічнае мастацтва, музейная і бібліятэчная справы. Нагодай для праграмы можа стаць цікавая выстаўка ці кінафестываль. Альбо адмыслова да юбілею запрашаем знакамітых асоб, гаворым пра іх творчасць і стаўленне да жыцця. Поле дзейнасці дастаткова шырокае, але, па сутнасці, мы гутарым пра сучаснае мастацтва, межы і жанры якога сёння вельмі размываюцца.

***— Як выбіраеце гасцей праграмы? Ці важнае тут меркаванне гледачоў?***

— У кожнай праграме я звяртаюся да гледачоў з просьбай дасылаць заяўкі і прапановы, але, па-шчырасці, яны не вельмі актыўна адгукаюцца. Таму часта гасцей выбіраем усёй камандай, рэдакцыяй праграмы. Арыентуемся на тое, што адбываецца ў свеце, у мастацтве, што на слыху і можа быць цікавым гледачу. Напрыклад, не так даўно зрабілі праграму пра бразільска-беларускі стрыт-арт, праект Vulica Brazil. Я была прыемна здзіўленая, што яго ладзілі маладыя людзі, якія зацікаўленыя ў тым, каб Мінск выглядаў прыгожа, развіваўся і быў далучаны да еўрапейскіх гарадскіх трэндаў.

> **«У XXI стагоддзі кантакт паміж людзьмі страчваецца, і дыялог патрэбна наладжваць, асабліва паміж дзеячамі мастацтва».**

***— Няма спакусы, як кажуць, карыстацца службовым становішчам і шмат размаўляць на праграме менавіта пра тэатр?***

— Мне ўвогуле здаецца, што тэатр — найлепшы від мастацтва *(смяецца)*. Ён убірае ў сябе і жывапіс, і кіно, і музыку... Так, я прапаную запрашаць гасцей, якія працуюць у гэтым мастацтве. Але мне цікавыя і іншыя галіны творчасці. Ці атрымаецца праграма цікавай, у многім залежыць ад таго, наколькі госць адкрыты, зацікаўлены, кантактны. Часам прыходзяць людзі, якіх я бачу ўпершыню, раней ведала толькі завочна, і іх таксама трэба выклікаць на шчырую размову.

***— А ў цэлым дзеячы беларускага мастацтва — людзі публічныя? Яны ахвотна працуюць на гледача?***

— Яны вельмі розныя. Артысты, рэжысёры, людзі публічнай працы сапраўды любяць размаўляць, вольна пачуваюцца перад камерай. Гэта ж іх работа. А вось мастакі, дызайнеры, якія не так часта выступаюць перад гледачамі, часам нават не разумеюць, што цікавага можа быць у такой гутарцы. Некаторых трэба нават угаворваць.

***— Ваш тата — вядомы навуковец, доктар мастацтвазнаўства Рычард Смольскі. Ён ухваляе работу на праграме?***

— Ён, чалавек навукі, марыў пра тое, каб я займалася толькі навуковай працай. Таму, калі паведаміла, што мяне запрасілі паспрабаваць весці гэтую праграму — дагэтуль працавала над тэлепраектам «Тэатр. Выбранае», — адразу раіў адмовіцца. Зараз тата глядзіць кожны выпуск «Дыя@блога» і гаворыць, што спадабалася, а што — не.

***— Студэнты з Акадэміі мастацтваў сочаць за работай выкладчыцы — ужо ў ролі тэлевядучай?***

— Часам яны глядзяць праграму, часцей за ўсё — у інтэрнэце. Мы нават нешта абмяркоўваем на занятках. Студэнтаў цікавяць выпускі, дзе госць ім вядомы, напрыклад, выкладчык акадэміі ці тэатральны дзеяч. Таксама цікавасць у іх выклікаюць праграмы, дзе абмяркоўваюцца маладзёжныя тэмы.

***— Як атрымліваецца спалучаць тэатральную крытыку і навуку, выкладанне і ролю тэлевядучай?***

— Рэцэпт насамрэч просты. Мне вельмі падабаецца тое, чым я займаюся. Люблю тэатр і тэатральную крытыку, веру ў тое, што тэатр можа змяняць грамадства ў лепшы бок. Вельмі падабаецца работа са студэнтамі і выкладанне, нашы дыскусіі падчас заняткаў. Тэлебачанне таксама люблю, мне імпануе фармат праграмы. Лічу, што ў XXI стагоддзі кантакт паміж людзьмі страчваецца, і дыялог трэба наладжваць, асабліва паміж дзеячамі мастацтва. Варта размаўляць пра тое, як агульнымі намаганнямі палепшыць жыццё. А яшчэ мяне страшэнна цікавіць унутраны свет чалавека.

***— Можа здавацца, што праграма, дзе абмяркоўваецца мастацтва, будзе нуднай для шырокай публікі. Хто глядач «Дыя@блога пра прыгожае»?***

— «Беларусь 3» сябе пазіцыянуе як канал, які спецыялізуецца на культурнай тэматыцы, таму і гледачы нашы не выпадкова на яго трапляюць. Яны — цікавяцца навакольным светам, сучасным мастацтвам і яго кантэкстам.




**У студыі «Дыя@блога» з генеральным дырэктарам Нацыянальнага мастацкага музея Уладзімірам ПРАКАПЦОВЫМ.**

Гэта людзі інтэлектуальныя, з актыўнай грамадзянскай пазіцыяй, якія могуць напісаць нам на праграму, задаць досыць крытычныя пытанні, якія мы абмяркоўваем з гасцямі.

***— Вы правакуеце дыскусію, пэўным чынам падштурхоўваеце публіку, каб вам пісалі пытанні і заўвагі?***

— Так, канешне, правакуем. Гэта наша работа. Здаровая правакацыя — добры спосаб выклікаць на дыялог. На вастрыню людзі актыўней адгукаюцца. У той жа час мы не ставім задачу зрабіць менавіта масавую праграму, тады трэба будзе зніжаць узровень, а мне гэтага рабіць вельмі не хацелася б. Як у сучасны тэатр, пра які я пішу як тэатральны крытык, — масавы глядач прыйдзе, калі паставіць камедыю не вельмі высокага гатунку. Але ў што тады ператворыцца сам тэатр? Навошта ён патрэбны?

***— Можаце прыгадаць смешныя ці незвычайныя выпадкі, што здараліся падчас здымак праграмы?***

— Ехала я неяк на запіс з высокай тэмпературай. Але паколькі ўсё запланавана загадзя, адмяніць здымкі было нельга. Госцем быў беларускі камедыйны артыст, парадыст Сяргей Кравец. Напачатку я адчувала сябе не вельмі добра, але падчас запісу госць пачаў парадзіраваць мяне, іншых гасцей, якіх я згадвала, нашу каманду, нейкіх знакамітасцяў. Я ніколі так не смяялася! І пасля праграмы тэмпература знізілася, я адчувала сябе проста выдатна. Можна сказаць, выздаравела дзякуючы праграме.

***— Праект «Дыя@блог» мае шэраг тэматычных праграм — пра мову, літаратуру, вечнае. Сочыце за работай калег?***

— Так, і часам нават магу даслаць пытанні, каментарыі. Неяк у «Дыя@блогу пра літаратуру» госцем быў Валерый Анісенка, мастацкі кіраўнік Коласаўскага тэатра, з якім мы раней разам працавалі ў Тэатры беларускай драматургіі. Я таксама з задавальненнем далучылася да дыскусіі.

> **«Я амаль не раздзяляю жыццё на працу і адпачынак. Гэта адзіны працэс, проста так жыву».**

***— Журналісты, якія часта бяруць інтэрв'ю, маюць прафесійныя «фішкі», як разгаварыць чалавека. Падзеліцеся сваімі сакрэтамі?***

— У мяне досыць развітая інтуіцыя, я добра адчуваю людзей, акрамя таго, займаюся гештальт-псіхалогіяй, таму магу адразу «сканіраваць» чалавека, стараюся зразумець, хто перада мной. Але ёсць агульнае правіла: кожны чалавек рэагуе на простае, добразычлівае стаўленне. Таксама ўсім падабаецца, калі імі цікавяцца. Таму пачынаю з простага, пытаюся, ці камфортна госцю перад камерай, стараюся супакоіць. З такім клопатам чалавек усё больш раскрываецца, а добразычлівае стаўленне дапамагае наладзіць кантакт.

***— Рыхтуючы пытанні, арыентуецеся на глыбіню ці вастрыню? Ёсць пытанні, якія ніколі не задасце?***

— Правакацыйныя пытанні задаю, каб гутарка была больш вострай. Перад запісам часам пытаюся ў госця, пра што нямарта гутарыць, таксама не буду задаваць прыватных пытанняў, што датычаць рэлігійных ці палітычных поглядаў. Гэта цікава менш, бо адносіцца да іншай сферы. З расійскіх калег на тэлебачанні мне падабаецца Уладзімір Познер. Ён заканчвае гутаркі апытанкай Марсэля Пруста, якая змяшчае глыбока філасофскія пытанні. Напрыклад, што вы скажаце Богу, калі апыняцеся перад ім? Не кожная тэма дазваляе выкарыстоўваць такі падыход, але калі робім праграму менавіта пра творчую асобу — дызайнера ці артыста, то паглыбляемся ў больш філасофскі, глыбокі пласт.

***— Як вы адпачываеце? Напэўна, складана сапраўды адпачыць, калі любы спектакль, выстаўка, паход у музей асацыююцца з работай?***

— Я амаль не раздзяляю жыццё на працу і адпачынак. Гэта адзіны працэс, проста так жыву. Мне вельмі цікавае сучаснае мастацтва, як яно развіваецца, таму часта наведваю выстаўкі, кінафестывалі, тэатральныя прэм'еры. Для мяне гэта спосаб пазнаваць сябе, адчуваць сябе жывой, развівацца і мяняцца да лепшага. Люблю чытаць, цяпер з захапленнем чытаю творы канадскай пісьменніцы, Нобелеўскай лаўрэаткі Эліс Манро. Мне вельмі падабаецца, як яна апісвае людзей, сумяшчае псіхалагічны і сацыяльны бакі. Захапляюся гештальт-псіхалогіяй, дзякуючы якой я зразумела, што можна быць сабой і не імкнуцца быць падобным на нейкі ідэал. Ведаеце, жыць увогуле вельмі цікава, галоўнае толькі памятаць, што існаванне не вечнае і трэба паспець так шмат зрабіць!

**Марына ВЕСЯЛУХА.**
*vesialuha@zviazda.by*

## Аўторак, 8 лістапада

### Беларусь 1

**6.00, 7.20, 8.15** Добрай раніцы, Беларусь!
**7.00, 8.00, 9.00, 12.00, 15.00, 19.00, 0.20** Навіны.
**7.05, 8.05** Навіны эканомікі.
**7.10, 8.10, 19.40, 23.40** Зона Х.
**9.10 Меладрама «Шэсць сотак шчасця».**
**10.00, 13.00, 16.00** 90 секунд.
**11.00, 20.00 Серыял «Жаночы доктар-2».**
**12.10, 16.30 Серыял «Сямейныя меладрамы-6».**
**13.20** Дзень у вялікім горадзе.
**14.20** Дзіцячы доктар.
**15.15, 18.40** Навіны рэгіёна.
**15.25 Серыял «Залатая краіна». 1-я серыя.**
**17.35** Беларуская часінка.
**19.20, 0.00** Сфера інтарэсаў.
**21.00** Панарама.
**21.45** Актуальнае інтэрв'ю.
**22.00 Серыял «След».**
**0.40** Дзень спорту.
**0.50 Серыял «Гетэры маёра Сакалова». 1-я серыя.**

### Беларусь 2

**7.00** Тэлераніца.
**9.00, 22.05** Тэлебарометр.
**9.05, 1.05** «Анлайн». Скетчкам.
**9.35, 18.35 Дэтэктыў «Такая работа».**
**10.25, 20.55** «Экстрасэнсы дэтэктывы».
**11.20, 17.05 Серыял «Мая цудоўная нянька».**
**11.55, 17.35 Серыял «Не нарадзіся прыгожай».**
**12.55, 19.35** «Ікона стылю». Fashion-шоу.
**14.10** «Паненка-сялянка». Рэаліці-шоу.
**15.20** «Пін_код». Інтэрактыўны маладзёжны праект.
16.05, 22.10 Дэтэктыў «Трынаццаць». 1-я серыя.
**22.00** Спортлато 6 з 49, КЕНО.
**23.15 Трылер «Лэдзі знікаюць апоўначы». 1—2-я серыі.**

### Беларусь 3

**7.00** «Дабраранак».
**7.35, 11.55** «Беларуская кухня». Зуцы (катлеты з грыбоў).
**8.05, 11.15, 21.00** «Калейдаскоп». Навіны культуры.
**8.20, 18.00 «Дастаеўскі». Драма.**
**9.20** «Новая старая казка». Фільм — дзецям.
**10.50** «Святло далёкай зоркі». Памяці народнай артысткі СССР Стэфаніі Станюты.
**11.30** «Музеі Беларусі». Мемарыяльны комплекс «Буйніцкае поле». Этнаграфічны комплекс «Беларуская вёска XIX ст.».
**12.25** «Размаўляем па-беларуску». Тэлевіктарына.
**12.55, 21.20** «Прывалаўскія мільёны». Драма. 1-я серыя.
**14.20** «Гарадок кавальскіх майстроў». Дак. фільм.
**14.45** «Размаўляем па-беларуску».
**14.50, 20.00 «Стаўка». Фільм першы, «Катастрофа».**
**15.30** «Кахаць па-руску». Меладрама.
**17.00, 22.40** «Дыя@блог». Пра вечнае.
**17.25** «Апошні дзень». Муслім Магамаеў.
**19.00 «Гваздзік». Драма.**
**20.40** «Калыханка».

### Беларусь 5

**7.45** PRO спорт. Вынікі тыдня.
**8.25** Хакей. Ліга чэмпіёнаў. 1/8 фіналу. Першы матч. «Лугана» (Швейцарыя) — «Цюрых» (Швейцарыя).
**10.15** Час футбола.
**11.00** Гандбол над Бугам.
**11.30** Фактар сілы.
**12.00** Валейбол. Ліга чэмпіёнаў. 2-і кваліфікацыйны раўнд. Матч у адказ. Жанчыны. ХПК (Хяменліна, Фінляндыя) — «Мінчанка» (Беларусь).
**14.05** Футбол. Ліга чэмпіёнаў УЕФА. 4-ы тур. Агляд гульнявога дня.
**15.10** Футбол. Ліга Еўропы УЕФА. 4-ы тур. «Фенербахчэ» — «Манчэстэр Юнайтэд».
**17.05** Футбол. Ліга Еўропы УЕФА. 4-ы тур. Агляд.
**18.00** Спорт-кадр.
**18.30** Авертайм.
**19.00, 21.50** PRO спорт. Навіны.
**19.10** Авертайм. КХЛ.
**19.25** Хакей. КХЛ. «Дынама-Мінск» — «Адмірал» (Уладзівасток). (У перапынку — Авертайм. КХЛ).
**22.00** Гандбол. SEHA-ліга. «Веспрэм» (Венгрыя) — БГК імя Мяшкова (Беларусь).
**23.30** Хакей. Ліга чэмпіёнаў. 1/8 фіналу. Матч у адказ.

### АНТ

**6.00, 6.30, 7.00, 7.30, 8.00** (з субцітрамі), **8.30, 9.00** (з субцітрамі), **11.00, 13.00, 16.00, 18.00** (з субцітрамі), **20.30** Навіны.
**6.05, 8.05** «Наша раніца».
**9.05** «Жыць здарова!»
**10.25** «Кантрольная закупка».
**11.05, 13.05, 16.15, 18.15** (з субцітрамі), **21.00** Навіны спорту.
**11.10** «Модны прыгавор».
**12.10** «Сам-насам з усімі».
**13.10** «Мужчынскае/Жаночае».
**14.10** «Пра каханне».
**15.10, 16.20** «Час пакажа».
**16.55 «Давай пажэнімся!»**
**18.20 Серыял «Татавы дочкі».**
**18.50** «Няхай гавораць».
**20.00** Час.
**21.05 Серыял «Таямнічая страсць».**
**22.55** «25 гадоў пасля СССР».
**23.40** «Вячэрні Ургант».
**0.15 Серыял «Агент нацыянальнай бяспекі».**
**2.00** Начныя навіны.

### СТБ

**6.00, 7.30, 10.30, 13.30, 16.30, 19.30, 22.30** «24 гадзіны».
**6.10, 17.25** «Міншчына».
**6.20, 7.45** «Раніца. Студыя добрага настрою».
**7.40, 20.10, 22.55** «СТБ-спорт».
**8.30** «Дарагая перадача».
**8.40 Меладрама «Давайце патанцуем».**
**10.40** «Далёкія сваякі».
**10.50** «Сямейныя драмы».
**11.50, 17.35** «Званая вячэра».
**13.50** «Наша справа».
**14.05 Маст. фільм «Глядзі ва ўсе вочы!»**
**15.25 «Следакі». Серыял.**
**15.55** «Вялікі горад».
**16.50** «Цэнтральны рэгіён».
**20.00** «Сталічныя падрабязнасці».
**20.15** «Тэрыторыя памылак».
**21.55** «Глядзець усім!»
**23.05** «Аўтапанарама».
**23.25** «Тайны Чапман».
**0.20 Камедыя «Салдат Іван Броўкін».**

### МІР

**6.00** М/ф.
**7.00** «Экстрасэнсы. Па той бок іншага свету».
**7.30** Добрай раніцы, свет!
**9.00 Серыял «Балабон».**
**12.30** «Цяжар абеду».
**13.00, 16.00, 19.00** Навіны (бягучы радок).
**13.15, 19.20 Серыял «Пад прыкрыццём».**
**16.10** Ток-шоу «Слова за словам».
**17.05 Серыял «Атрад».**
**22.00 Маст. фільм «Ледзяная страсць».**
**23.45 Маст. фільм «Калі б...»**
**2.10 Серыял «Невідзімкі».**

### РТР—Беларусь

**7.00** «Раніца Расіі».
**11.00, 14.00, 17.00, 20.00** Весткі.
**11.35** «Пакой смеху».
**12.00** «60 хвілін». Ток-шоу.
**13.15** «Правілы жыцця».
**13.50, 16.50, 19.50, 23.00** Навіны — Беларусь.
**14.35** «Пра самае галоўнае». Ток-шоу.
**15.40** «Прамы эфір».
**17.20 Серыял «Сваты».**
**19.10, 20.40 Серыял «Касатка».**
**21.45, 23.10 Серыял «Грамадзянін Ніхто».**
**23.35** «Простыя пытанні» з Ягорам Хрусталёвым.
**23.55** «Каманда».

### НТБ—Беларусь

**5.55** «Астрапрагноз».
**6.00** «Новая раніца».
**7.30** «Студыя Юліі Высоцкай».
**8.10 Серыял «Вяртанне Мухтара».**
**10.00, 13.00, 16.00, 19.00** Сёння.
**10.25 Серыял «Ляснік».**
**12.00** Суд прысяжных.
**13.25, 23.05** Агляд. Надзвычайнае здарэнне.
**14.05 Серыял «Урачэбная тайна».**
**16.25 Серыял «Вуліцы разбітых ліхтароў».**
**18.05** «Гаворым і паказваем». Ток-шоу.
**19.40 Серыял «Брат за брата».**
**23.30** «Вынікі дня».
**0.00 Серыял «Марскія д'яблы».**

### 8 канал

**6.30** Раніца на «Восьмым».
**10.30** «Мой любімы гадаванец».
**11.00 Камедыя «Сяброўкі».**
**12.30** Дак. серыял «Скрозь прастору і час».
**13.15 Серыял «Цяжкі пясок».**
**14.05 Трылер «Паветраны маршал».**
**15.55, 19.05, 21.05, 23.55** «Надвор'е».
**16.00** «Мультпарад».
**16.25** «Апавяданні пра жывёл».
**17.10 Серыял «Ідэальная пара».**
**18.00, 19.10, 21.00** «Хатняя крама».
**18.10 Серыял «Чалавек у высокім замку».**
**19.15 Серыял «На ўсе застаўкі».**
**20.50** «Вечарніца».
**21.10** «Даведнік па краінах і кантынентах».
**21.20 Драма «Ракавая страсць».**
**23.10 Серыял «Закон і парадак».**




# Прымхі да скрухі давядуць

**Штотыдзень у эфіры тэлеканала «Беларусь 3» тэлевіктарына «Размаўляем па-беларуску». Для таго каб стаць яе ўдзельнікамі, неабходна зайсці на сайт tvrgomel.by або 3belarus.by і праз банер «Размаўляем па-беларуску» запоўніць заяўку на каманду з трох чалавек. Ну, а праверыць сваё веданне роднай мовы пасля таго, як праграма выйшла ў эфір, можна з дапамогай «Звязды».**
**Ці ведалі вы, што:**

**Скру́ха** — туга, маркота. «Радасць чалавечая ўсё ж такі мацней за скруху і беспатольнае гора», — чытаем у Рамана Сабаленкі.

**Прасна́к** — тоўсты блін з прэснага цеста. «Маці цеста тады ўчыніла з вадой, праснакоў нарабіла з чарамхай лясной», — пісаў Уладзімір Дубоўка.

**Пры́мхі** — забабоны, забабонныя прыкметы. «І хоць Алесь ніколі не верыў ні ў якія забабоны і прымхі, сарваў рамонак і пачаў варажыць», — чытаем у Петруся Броўкі.

**Рошчына** — негустое цеста на дражджах, якое пасля замешваюць. «[Маша] раскрыла дзежку, удыхнула прыемны, кіслы пах рошчыны», — чытаем у Івана Шамякіна.

**Мы́ліца** — прылада, на якую апіраецца чалавек з хворымі нагамі. «Стаяла двое калек-салдат — адзін на двух мыліцах, другі — на драўлянай назе», — пісаў Цішка Гартны.

**Уломак** — слабы, кволы чалавек. «...Стары, бывае, не вытрымае, возьме яго на рукі, як хлапчанё, і зараз жа ўціхамірыцца, хоць Раман і не ўломак», — чытаем у Якуба Коласа.

**Абы з рук** — вельмі нядбала, без ахвоты і старання працаваць, рабіць. Беларускія адпаведнікі: абы дзень да вечара, цераз пень калоду, з плеч ды ў печ, з пятага на дзясятае, пусці палюся, так-сяк накасяк, цапам-лапам. Руская: спустя рукава, тяп-ляп.

**Як рэпу грызці** — вельмі добра, без памылак. Беларусы яшчэ скажуць: як па пісаным, як па нотах. Руская: как орешки щелкать.

**Чарговыя выпускі тэлевіктарыны глядзіце ў эфіры «Беларусь 3» раніцай кожную суботу.**

**Ірына АСТАШКЕВІЧ.**
*iost@zviazda.by*

### ВТБ

**6.00, 17.00** «Турбаміксер».
**7.00** М/ф «Смяшарыкі».
**7.20** М/ф «Фіксікі».
**7.50** М/ф «Маша і мядзведзь».
**8.10** «Ералаш».
**8.30, 18.00** Серыял «Вароніны».
**9.40** Камедыя «Ліхач».
**11.40** «Здаецца! З рамонтам!»
**12.50** «Паспець за 24 гадзіны».
**14.00** Серыял «Два бацькі, два сыны 3».
**14.40** «Уральскія пельмені».
**15.50, 20.20** Серыял «Маладзёжка 5».
**19.10** Серыял «Кухня 5».
**21.30** Фэнтэзі «Прывідны гоншчык 2».
**23.30, 5.00** Серыял «Тут хтосьці ёсць...»
**0.30** Серыял «Бязмоўны сведка».
**2.30, 4.30** Скетч-шоу «Даеш моладзь».
**3.00** «Дурні і дарогі».
**3.30** Скетч-шоу «6 кадраў».
**4.00** «Лаві момант».

### Культура

**6.30** «Еўраньюс».
**10.00, 15.00, 19.30, 23.30** Навіны культуры.
**10.15, 1.55** «Назіральнік».
**11.15, 23.50** «Каломба». Серыял.
**12.55** «Правілы жыцця».
**13.20** «Пятае вымярэнне».
**13.50** «Авадзень». Маст. фільм. 1-я серыя.
**15.10** Да 95-годдзя Тэатра імя Яўг. Вахтангава. Юрый Якаўлеў, Аляксандр Гравэ, Васіль Ланавой, Міхаіл Ульянаў, Вячаслаў Шалевіч у спектаклі «Конармія». Запіс 1975 года.
**17.30** «Астравы». Юрый Якаўлеў.
**18.10** Гістарычныя канцэрты. Артура Бенедэцці Мікеланджэла.
**19.05** «Гілберт Кіт Чэстэртан». Дак. фільм.
**19.15** «Добрай ночы, малыя!»
**19.45** Галоўная роля.
**20.05** Штучны адбор.
**20.45** «Галіне Вішнеўскай прысвячаецца...» Гала-канцэрт зорак сусветнай оперы.
**22.45** «Лаа-цзы». Дак. фільм.
**23.00** «Сачыненне жыцця». Дак. серыял.
**23.45** Мастсавет.
**1.25** Сусветныя скарбы.

### Настальгія

**6.00** Маст. фільм «Васіліса Прыгожая».
**7.05, 8.45, 11.35, 13.05, 15.40, 17.00, 17.40, 18.50, 20.40, 21.40, 23.00, 23.45** Музычная настальгія.
**7.45** «Творчы вечар Аркадзя Арканава». 1990 год.
**9.00** Тэлеспектакль «Мір дому твайму». 1987 год.
**12.00** «СевАлогія» з Севам Наўгародцавым: «Ролінг Стоўнз». 2005 год.
**13.15** Маст. фільм «Дажывём да панядзелка».
**15.00, 21.00** «Мінулы час».
**16.00, 22.00** «Народжаны ў СССР».
**17.20** Дак. фільм «Другая пяцігодка».
**18.00** «Эліта Краіны Саветаў». Дзмітрый Язаў. 2007 год.
**19.10** Маст. фільм «Дзікі сабака Дынга».
**23.20** Дак. фільм «Вялікія містыфікатар».
**0.00** «Акулы пяра». Аляксандр Новікаў. 1996 год.
**0.50** Маст. фільм «Прызнанне ў каханні».
**3.00** «Быў час». 2009 год.
**4.00** Фільм-спектакль «Антоній і Клеапатра». 1980 год.

### EuroSport 1

**5.00, 6.30, 11.00, 17.00, 3.30** Футбол. Чэмпіянат MLS. Плэй-оф.
**8.00, 22.30** Снукер. China Championship. Фінал.
**9.00, 2.00** Watts.
**10.00** Футбол. «ФІФА».
**10.30, 3.00** Футбол. Чэмпіянат MLS.
**13.30** Лёгкая атлетыка. Марафон.
**15.00, 20.30** Фігурнае катанне. Этап Гран-пры. Кубак Расіі.
**19.30** Футбол. Еўра-2017. Жанчыны. Лёсаванне.
**0.30** Аўтаспорт. Этап чэмпіянату свету па гонках на вынослівасць.
**1.00** Дроны. DR 1 Invitational.

### КИНОКОМЕДИЯ Кінакамедыя

**0.20** Камедыя «Дом з паранармальнымі з'явамі 2».
**1.55** Меладрама «Былыя: лепшыя сябры!»
**3.35, 14.00, 14.45, 15.35** Скетчкам «Паміж намі».
**3.55** Камедыя «Дыска».
**5.45** Прыгоды «Вялікі салдат».
**7.30** Меладрама «Каханне і іншыя катастрофы».
**9.05** Камедыя «Каханне ўразнос».
**10.35** Камедыя «Бінга Бонга».
**12.25** Меладрама «Спачатку каханне, потым вяселле».
**14.15, 15.05** «Камедыянты (Шоу)».
**16.00** Камедыя «Тата напракат». 3-я серыя.
**16.50** Камедыя «Тата напракат». 4-я серыя.
**17.40** Камедыя «Дазвольце цябе пацалаваць... зноў».
**19.30** Камедыя «Ні хвіліны спакою».
**20.55** Камедыя «Усё пуцём!»
**22.40** Камедыя «Канікулы мары».

### ТБ3

**6.00** М/ф.
**8.00** «Доктар І...»
**8.30, 18.50, 2.30** «Асколкі». Серыял.
**10.05, 4.00** «Судовыя страсці». Дак. серыял.
**11.45** «Сляпая».
**12.45** «Варажбітка».
**13.50** «Паралельны свет».
**14.50** «Ёсць адзін сакрэт».
**15.20** «Здзелка».
**15.50** «Ежа, я люблю цябе».
**16.45, 21.40** «Рэвізора».
**17.50** «Тайны следства». Серыял.
**20.45, 1.40** «Жанна, пажані».
**22.45** «Вялікія пачуцці».
**23.20** «Звышнатуральнае». Серыял.
**0.05** «Голая праўда». Камедыя.
**5.30** «Зоркі і містыка».

### TV 1000 ТБ1000

**6.10** Трагікамедыя «Пра Шміта».
**8.30** Меладрама «Адна сустрэча».
**10.10** Вестэрн «Апалуза».
**12.10** Трылер «Гісторыя аднаго вампіра».
**14.10** Фэнтэзі «Акадэмія вампіраў».
**16.10** Фільм жахаў «Упусці мяне. Сага».
**18.20** Фантастыка «Іншы свет: Паўстанне ліканаў».
**20.10** Містыка «Інтэрв'ю з вампірам».
**22.25** Камедыя жахаў «Рэальныя крывасмокі».
**0.10** Трылер «Выжывуць толькі палюбоўнікі».
**2.20** Драма «Развітальны квартэт».
**4.20** Трылер «Параноя».

### ТБ1000 Рускае кіно

**6.20** Камедыя «Усё ўключана 2».
**8.20** Трагікамедыя «Коля — перакаці-поле».
**10.20** Драма «Карасі».
**12.20** Драма «Прорва».
**14.20** Камедыя «Руд і Сэм».
**16.20** Меладрама «Смайлік».
**18.15** Баявік «Слізгаценне».
**20.20** Меладрама «На кручку!»
**22.10** Драма «Паддубны».
**0.30** Дэтэктыў «Прэзумпцыя віны».
**2.35** Камедыя «Дзень радыё».
**4.40** Камедыя «30 спатканняў».

### National Geographic

**6.00, 12.30, 20.15** Гульні розуму.
**6.50, 13.15, 21.00, 0.50, 4.00, 5.30** Навуковыя недарэчнасці.
**8.45, 14.50, 21.45, 1.40, 4.45** Шырокі погляд.
**9.30** Непаражальныя канструкцыі.
**10.15, 11.45, 15.35, 17.50** Міжнародны аэрапорт Дубай.
**11.00** Дзікі тунец.
**16.20, 19.30, 23.20, 3.15** Расследаванні авіякатастроф.
**17.10** Непаражальныя канструкцыі.
**18.35** Твар у твар...
**22.30** Дагістарычныя монстры Гітлера.
**0.05** Паранармальнае.
**2.25** Крытычная сітуацыя.

### Discovery

**8.00, 14.00** Аляска: сям'я з лесу.
**9.00, 15.30, 21.30, 5.55** Як гэта ўстроена?
**9.30, 15.00, 21.00, 5.30** Як гэта зроблена?
**10.00, 16.00, 23.00, 7.10** Паляўнічыя на рэліквіі.
**10.30, 16.30, 23.30, 7.35** Багажныя войны.
**11.00** Хуткія і гучныя.
**12.00** Свяшчэнная сталь.
**13.00** Бітва рэт-родаў.
**17.00, 22.00, 2.55** Махінатары.
**18.00** Мяцежны гараж.
**0.00, 3.50** Залатая ліхаманка.
**1.00, 6.20** Што было далей?
**1.30, 6.45** Звышчалавечая навука.
**2.00, 4.40** Самагоншчыкі.

## Тэлесеткі

# МУЖЧЫНЫ — НА ЭКРАН

**Новую плынь вядучых шукае тэлеканал «НТБ-Беларусь». Праўда, з удакладненнем: на кастынг запрашаюцца выключна мужчыны ва ўзросце 30—45 гадоў.**

У астатнім патрабаванні да кандыдатаў стандартныя: наяўнасць таленту, харызмы, мэтанакіраванасць, прыемная знешнасць і добрая дыкцыя, абавязкова дасканалае веданне рускай і беларускай мовы, а таксама пажадана ўменне хутка запамінаць тэкст і імправізаваць у кадры. Для запрашэння на кастынг неабходна папярэдне пакінуць заяўку на афіцыйным сайце Белтэлерадыёкампаніі www.tvr.by («Тэлебачанне» — «НТБ-Беларусь» — «Кастынг»). Па выніках адбораў тры найбольш перспектыўныя прэтэндэнты атрымаюць прапановы ад «НТБ-Беларусь».

**Вікторыя ЗАХАРАВА**
*zaharava@zviazda.by*

## Серада, 9 лістапада

### Беларусь 1

**6.00, 7.20, 8.15** Добрай раніцы, Беларусь!
**7.00, 8.00, 9.00, 12.00, 15.00, 19.00, 0.20** Навіны.
**7.05, 8.05** Навіны эканомікі.
**7.10, 8.10, 19.40, 23.40** Зона Х.
**9.10, 22.00 Серыял «След».**
**10.00, 13.00, 16.00** 90 секунд.
**11.00, 20.00 Серыял «Жаночы доктар-2».**
**12.10, 16.30 Серыял «Сямейныя меладрамы-6».**
**13.20** Дзень у вялікім горадзе.
**14.20** Дзіцячы доктар.
**15.15, 18.40** Навіны рэгіёна.
**15.25 Серыял «Залатая краіна».**
**17.35** Беларуская часінка.
**19.20, 0.00** Сфера інтарэсаў.
**21.00** Панарама.
**21.45** Спецыяльны рэпартаж.
**0.35** Дзень спорту.
**0.50 Серыял «Гетэры маёра Сакалова».**

### Беларусь 2

**7.00** Тэлераніца.
**9.00, 22.05** Тэлебарометр.
**9.05, 0.55** «Анлайн». Скетчкам.
**9.30, 18.40 Дэтэктыў «Такая работа».**
**10.20, 20.55** «Экстрасенсы-дэтэктывы».
**11.20, 17.05 Серыял «Мая цудоўная нянька».**
**11.55, 17.35 Серыял «Не нарадзіся прыгожай».**
**12.55, 19.35** «Ікона стылю». Fashion-шоу.
**14.10** «Паненка-сялянка». Рэаліці-шоу.
**15.20** «Пін_код». Інтэрактыўны маладзёжны праект.
**16.05, 22.10 Дэтэктыў «Трынаццаць».**
**22.00** Спортлато 5 з 36, КЕНО.
**23.15 Трылер «Лэдзі знікаюць апоўначы». Заключныя серыі.**

### Беларусь 3

**7.00** «Дабраранак».
**7.35, 12.05** «Беларуская кухня». Мяса ў цесце.
**8.05, 11.15, 21.00** «Калейдаскоп». Навіны культуры.
**8.20, 18.00 «Дастаеўскі». Драма.**
**9.20 «Асцярожна, дзеці!» Фільм — дзецям.**
**10.35** М/ф.
**10.55** «Святло далёкай зоркі». Памяці мастака Юрыя Герасіменкі.
**11.40** «Наперад у мінулае».
**12.35** «Размаўляем па-беларуску». Тэлевіктарына.
**13.05** «Купала і Колас. Два яблыкі на адной галінцы». Дак. фільм.
**13.30, 21.20 «Прывалаўскія мільёны». Драма. 2-я серыя.**
**14.50, 20.00** «Стаўка». «Чорная паласа».
**15.30 «Кахаць па-руску 2». Меладрама.**
**17.05, 22.40** «Дыя@блог». Пра прыгожае.
**17.30** «У гасцях у Барыса Аверына».
**17.55** «Размаўляем па-беларуску».
**19.00** «Гваздзік». Драма.
**20.40** «Калыханка».

### Беларусь 5

**7.45, 19.15, 22.00** PRO спорт. Навіны.
**7.55** Спорт-кадр.
**8.25** Авертайм.
**8.55** Хакей. Ліга чэмпіёнаў. 1/8 фіналу. Матч у адказ.
**10.50** Хакей. Кубак Дружбы-2016. Беларусь (U-18) — Данія (U-18).
**12.45** Баскетбол. Еўраліга. «Црвена Звезда» (Сербія) — «Басконія» (Іспанія).
**14.25** Футбол. Ліга чэмпіёнаў УЕФА. Відэачасопіс.
**14.55** Хакей. КХЛ. «Дынама-Мінск» — «Адмірал» (Уладзівасток).
**16.55** Гандбол. SEHA-ліга. «Веспрэм» (Венгрыя) — БГК ім. Мяшкова (Беларусь).
**18.25** Козел пра футбол.
**18.45** Слэм-данк.
**19.25** Хакей. КХЛ. «Дынама» (Масква) — СКА (Санкт-Пецярбург).
**22.10** Футбол. Таварыскі матч. Грэцыя — Беларусь.

### АНТ

**6.00, 6.30, 7.00, 7.30, 8.00** (з субцітрамі), **8.30, 9.00** (з субцітрамі), **11.00, 13.00, 16.00, 18.00** (з субцітрамі), **20.30** Нашы навіны.
**6.05, 8.05** «Наша раніца».
**9.05** «Жыць здорава!»
**10.25** «Кантрольная закупка».
**11.05, 13.05, 16.15, 18.15** (з субцітрамі), **21.00** Навіны спорту.
**11.10** «Модны прыгавор».
**12.10** «Сам-насам з усімі».
**13.10** «Мужчынскае/Жаночае».
**14.10** «Пра каханне».
**15.10, 16.20** «Час пакажа».
**16.55** «Давай пажэнімся!»
**18.20** Серыял «Татавы дочкі».
**18.50** «Няхай гавораць».
**20.00** Час.
**21.05 Серыял «Таямнічая страсць».**
**22.55** «25 гадоў пасля СССР».
**23.40** «Круты маршрут Васіля Аксёнава».
**0.40 Серыял «Агент нацыянальнай бяспекі».**
**2.20** Начныя навіны.

### СТБ

**6.00, 7.30, 10.30, 13.30, 16.30, 19.30, 22.30** «24 гадзіны».
**6.10, 17.25** «Міншчына».
**6.20, 7.45** «Раніца. Студыя добрага настрою».
**7.40, 20.10, 22.55** «СТБ-спорт».
**8.30, 23.05** «Тайны Чапман».
**9.30, 18.35** «Самыя шакіруючыя гіпотэзы».
**10.40** «Сямейныя драмы».
**11.40** «Не хлусі мне!»
**12.35, 17.35** «Званая вячэра».
**13.50** «Тэрыторыя памылак».
**15.30 «Следакі». Серыял.**
**16.50** «Аўтапанарама».
**17.10** «Ведай нашых!»
**20.00** «Сталічныя падрабязнасці».
**20.15** «Сакрэтныя тэрыторыі».
**22.00** «Глядзець усім!»
**23.55 Камедыя «Іван Броўкін на цаліне».**

### МІР

**6.00** М/ф.
**7.00** «Экстрасэнсы. Па той бок іншага свету».
**7.30** Добрай раніцы, свет!
**9.00 Серыял «Балабон».**
**12.30** «Цяжар абеду».
**13.00, 16.00, 19.00** Навіны (бягучы радок).
**13.15, 19.20 Серыял «Пад прыкрыццём».**
**16.10** Ток-шоу «Слова за слова».
**17.05 Серыял «Атрад».**
**22.00 Маст. фільм «Флэшка».**
**0.00 Маст. фільм «Хамраз».**
**3.05 Серыял «Невідзімкі».**

### РТР—Беларусь

**7.00** «Раніца Расіі».
**11.00, 14.00, 17.00, 20.00** Весткі.
**11.35** «Простыя пытанні» з Ягорам Хрусталёвым.
**12.00** «60 хвілін». Ток-шоу.
**13.15** «Правілы жыцця».
**13.50, 16.50, 19.50, 23.00** Навіны — Беларусь.
**14.35** «Пра самае галоўнае». Ток-шоу.
**15.40** «Прамы эфір».
**17.20 Серыял «Сваты».**
**19.10, 20.40 Серыял «Касатка».**
**21.45, 23.10 Серыял «Грамадзянін Ніхто».**
**0.45** «Вечар з Уладзімірам Салаўёвым».

### НТБ—Беларусь

**5.55** «Астрапрагноз».
**6.00** «Новая раніца».
**7.30** «Студыя Юліі Высоцкай».
**8.10 Серыял «Вяртанне Мухтара».**
**10.00, 13.00, 16.00, 19.00** Сёння.
**10.25 Серыял «Ляснік».**
**12.00** Суд прысяжных.
**13.25, 23.05** Агляд. Надзвычайнае здарэнне.
**14.05 Серыял «Урачэбная тайна».**
**16.25 Серыял «Вуліцы разбітых ліхтароў».**
**18.05** «Гаворым і паказваем». Ток-шоу.
**19.40 Серыял «Брат за брата».**
**23.30** «Вынікі дня».
**0.00 Серыял «Марскія д'яблы».**

### 8 канал

**6.30** Раніца на «Восьмым».
**10.30** «Адшукваецца адпачынак».
**11.00 Камедыя «Асаблівасці нацыянальнага палявання».**
**12.35** Дак. серыял «Скрозь прастору і час».
**13.15 Серыял «Цяжкі пясок».**
**14.10 Баявік «На адлегласці ўдару».**
**15.55, 19.05, 21.05, 23.45** «Надвор'е».
**16.00** «Мультпарад».
**16.30** «Золата маўчання».
**16.45 Серыял «Крык савы».**
**17.35, 19.10, 21.00** «Хатняя крама».
**17.40 Серыял «Чалавек у высокім замку».**
**18.35** «Мой любімы гадаванец».
**19.15 Серыял «На ўсе застаўкі».**
**20.50** «Вечарніца».
**21.10 Драма «Дзве жанчыны».**
**22.50 Серыял «Закон і парадак».**

### ВТБ

**6.00, 17.00** «Турбаміксер».
**7.00** М/ф «Смяшарыкі».
**7.20** М/ф «Фіксікі».
**7.50** М/ф «Маша і мядзведзь».
**8.10** «Ералаш».
**8.30, 18.00** Серыял «Варонiны».
**9.40** Драма «Бунтарка».
**11.40, 14.40, 19.10** Серыял «Кухня 5».
**12.50** «Паспець за 24 гадзіны».
**14.00** Серыял «Два бацькі, два сыны 3».
**15.50, 20.20** Серыял «Маладзёжка 5».
**21.30** Трылер «Начны рэйс».
**23.20, 5.00** Серыял «Тут хтосьці ёсць...»
**0.20** Серыял «Бязмоўны сведка».
**2.20, 4.30** Скетч-шоу «Даеш моладзь».
**3.00** «Дурні і дарогі».
**3.30** Скетч-шоу «6 кадраў».
**4.00** «Лаві момант».

### Культура

**6.30** «Еўраньюс».
**10.00, 15.00, 19.30, 23.30** Навіны культуры.
**10.15, 1.55** «Назіральнік».
**11.15, 23.50** «Каломба». Серыял.
**12.55, 20.45** «Правілы жыцця».
**13.20** «Пешшу...» Масква ардэко.
**13.50** «Авадзень». Маст. фільм. 2-я серыя.
**15.10** Да 95-годдзя Тэатра імя Яўг. Вахтангава. Людміла Цалікоўская, Юрый Якаўлеў, Кацярына Райкіна ў спектаклі «Дамы і гусары». Запіс 1976 года.
**17.25** «Больш чым каханне». Людміла Цалікоўская.
**18.10** Гістарычныя канцэрты. Святаслаў Рыхтэр, Мсціслаў Растраповіч.
**19.05** «Канстанцін Цыялкоўскі». Дак. фільм.
**19.15** «Добрай ночы, малыя!»
**19.45** Галоўная роля.
**20.05** «Абсалютны слых».
**21.15** «Рафаэль. Шлях у Расію». Дак. фільм.
**21.55** Сусветныя скарбы.
**22.15** Улада факта. «Мадэрнізацыя па-іранску».
**23.00** «Сачыненне жыцця». Дак. серыял.
**23.45** Мастсавет.
**1.25** С. Рахманінаў. Саната № 2 для фартэпіяна.

### Настальгія

**6.20** «СевАлогія» з Севам Наўгародцавым: «Ролінг Стоўнз». 2005 год.
**7.25, 9.40, 11.00, 11.35, 12.50, 14.40, 15.40, 17.00, 17.45, 18.55, 20.45, 21.40, 23.00, 23.30, 1.05, 2.45, 5.35** Музычная настальгія.
**8.00** Маст. фільм «Дажывём да панядзелка».
**10.00, 16.00, 22.00** «Народжаныя ў СССР».
**11.20** Дак. фільм «Другая пятачка».
**12.00** «Эліта Краіны Саветаў». Дзмітрый Язаў. 2007 год.
**13.10** Маст. фільм «Дзікі сабака Дынга».
**15.00, 21.00** «Мінулы час».
**17.20** Дак. фільм «Вялікі містыфікатар».
**18.00** «Быў час» з Аляксандрам Паліткоўскім: «Шкодные мастацтва часоў СССР». 2007 год.
**19.10** Тэлеспектакль «Гульцы». 1978 год.
**23.20** «Мастак і паэт Міхаіл Гробман чытае свае вершы». 1-я частка. 2005 год.
**0.00** Маст. фільм «Васіліса Прыгожая».
**1.45** «Творчы вечар Аркадзя Арканава». 1990 год.
**3.00** Тэлеспектакль «Мір дому твайму». 1987 год.

### EuroSport 1

**5.00** Снукер. International Championship. Фінал.
**6.30, 13.30, 18.15, 20.45, 3.30** Горныя лыжы. Кубак свету. Жанчыны.
**7.15, 14.15, 19.00, 21.30** Горныя лыжы. Кубак свету. Мужчыны.
**8.00, 1.30** Футбол. «ФІФА».
**8.30** Фігурнае катанне. Этап Гран-пры. Кубак Расіі.
**10.30, 12.00, 17.00** Футбол. Чэмпіянат MLS. Плэй-оф.
**15.05, 19.45, 23.15** Лёгкая атлетыка. Марафон.
**22.15** Watts.
**0.30** Дроны. DR 1 Invitational.
**2.00** Баявыя майстэрствы. Суперкомбат.

### Кінакамедыя

**0.10** Меладрама «Купі, пазыч, украдзі».
**2.10** Камедыя «Ас з асаў».
**4.00** Прыгоды «Вялікі салдат».
**5.40** Меладрама «Спатканне ўслепую».
**7.25** Меладрама «Вялікая маленькая Я».
**9.00** Прыгоды «Сардэчна запрашаем у джунглі».
**10.40** Камедыя «Круты татачка».
**12.20** Камедыя «Нешта падобнае на шчасце».
**14.00, 14.45, 15.35** Скетчкам «Паміж намі».
**14.15, 15.05** «Камедыянты (Шоу)».
**16.00** Меладрама «Жаніх па аб'яве».
**17.50** Камедыя «Дазвольце цябе пацалаваць... на вяселлі».
**19.30** Камедыя «Псіхааналітык».
**21.25** Камедыя «Кахаю цябе на ўсіх мовах свету».
**23.10** Камедыя «Каханне ўразнос».

### ТБ3

**6.00** М/ф.
**7.55** «Доктар І...»
**8.25, 18.50, 2.55** «Асколкі». Серыял.
**10.00, 4.30** «Судовыя страсці». Дак. серыял.
**11.45** «Сляпая».
**12.45** «Варажбітка».
**13.50** «Паралельны свет».
**14.50** «Ёсць адзін сакрэт».
**15.20** «Здзелка».
**15.55** «Жанна, пажані».
**16.50, 21.40** «Рэвізора».
**17.50** «Тайны следства». Серыял.
**20.40, 2.00** «Магазіна».
**22.45** «Вялікія пачуцці».
**23.20** «Звышнатуральнае». Серыял.
**0.05** «Каўбоі супраць прышэльцаў». Фантастыка.

### ТБ1000

**6.10, 17.55** Драма «Дварэцкі».
**8.30** Містыка «Інтэрв'ю з вампірам».
**10.40** Фантастыка «Ева: штучны розум».
**12.25** Камедыя жахаў «Рэальныя крывасмокі».
**14.10** Трылер «Параноя».
**16.05** Драма «Развітальны квартэт».
**20.10** Драма «Вялікія вочы».
**22.10** Драма «Падмена».
**0.35** Драма «Галгофа».
**2.20** Трылер «Лофт».
**4.10** Драма «Бачнасць гневу».

### ТБ1000 Рускае кіно

**6.20** Драма «Паддубны».
**8.35** Меладрама «На кручку!»
**10.20** Дэтэктыў «Прэзумпцыя віны».
**12.20** Драма «Белая птушка з чорнай меткай».
**14.20** Камедыя «Дзень радыё».
**16.20** Камедыя «30 спатканняў».
**18.10** Драма «Каралёў».
**20.20** Драма «Мой зводны брат Франкенштэйн».
**22.30** Драма «Дуэль. Пушкін — Лермантаў».
**1.10** Камедыя «Уцячы, дагнаць, закахацца».
**2.40** Драма «Географ глобус прапіў».
**4.45** Драма «Арэлі».

### National Geographic

**6.00, 12.30, 20.10** Гульні розуму.
**6.50, 9.30, 13.10, 17.00, 5.35** Навуковыя недарэчнасці.
**7.55, 14.00, 21.00, 0.50, 4.00** Сапраўдны суперкар.
**8.40, 14.45, 21.45, 1.35, 4.45** Аўта-SOS.
**10.10, 17.55** Шырокі погляд.
**11.00** Дзікі тунец.
**11.40, 15.30** Міжнародны аэрапорт Дубай.
**16.15, 19.30, 23.20, 3.10** Расследаванні авіякатастроф.
**18.40** Твар у твар...
**22.30** 2000-я. Найвялікшыя трагедыі.
**0.00** Паранармальнае.
**2.20** Крытычная сітуацыя.

### Discovery

**8.00, 14.00** Аляска: сям'я з лесу.
**9.00, 15.30, 21.30, 5.55** Як гэта ўстроена?
**9.30, 15.00, 21.00, 5.30** Як гэта зроблена?
**10.00, 13.00, 16.00, 23.00, 7.10** Паляўнічыя на рэліквіі.
**10.30, 16.30, 23.30, 7.35** Багажныя войны.
**11.00** Паляўнічы на антыкварыят.
**12.00** Металаломшчыкі.
**17.00, 22.00, 2.55** Махінатары.
**18.00** Майстры патаргавацца.
**0.00, 3.50** Залатая ліхаманка.
**1.00, 6.20** Што было далей?
**1.30, 6.45** Звышчалавечая навука.
**2.00, 4.40** Самагоншчыкі.

## Усходні гараскоп на



**АВЕН.** Калі вы жадаеце дамагчыся вынікаў, трэба дзейнічаць мякка, але вельмі настойліва. Не сядзіце, склаўшы рукі, нават калі вы абсалютна ўпэўнены ў тым, што ўсё неабходнае для поспеху ўжо зроблена. Ад вашай актыўнасці менавіта цяпер будзе залежаць ўвасабленне планаў у рэальнасць. У чацвер, займаючыся любімай справай, можаце здабыць страчаную гармонію. Блізкім людзям патрабуецца ваш клопат, падтрымка ці хоць бы проста кампанія, ды і вы, знаходзячыся ў кампаніі, будзеце адчуваць сябе значна лепш.



**ЦЯЛЕЦ.** Не бойцеся новых пачынанняў, але пры гэтым сувымярайце з рэальнасцю свае сілы, каб не пачаць падаць ад стомы. Паглыбляючыся ў работу, не забывайце, што існуюць яшчэ і іншыя важныя сферы жыцця, якія могуць запатрабаваць ад вас пільнай увагі. У другой палове тыдня не выключаны канфлікты ў сям'і. У пятніцу можаце атрымаць важную інфармацыю ад начальства. У суботу не пажадана паддавацца залішняй мітусні, інакш каштоўны час расстраціцца па дробязях.



**БЛІЗНЯТЫ.** Будзьце гатовыя да барацьбы за сваё шчасце, ад намечанага не варта адступаць пры першай жа сустрэчы з перашкодамі. У выпадку неабходнасці лепш звярнуцца па дапамогу не да сяброў, а запрасіць кампетэнтных спецыялістаў. У чацвер пастарайцеся знізіць нагрузкі, бо ў гэты дзень вам будзе ўласцівая павышаная стамляльнасць. Пазбягайце сварак у пятніцу, хоць вы і будзеце больш звычайнага схільныя да гневу і раздражняльнасці. У выхадныя выберыцеся на прагулку, чытайце і размаўляйце з каханым чалавекам.



**РАК.** Вы нібы абудзіцеся ад доўгага сну. На гэтым тыдні ваша дзейнасць стане прыкметна больш інтэнсіўнай, не выключана, што зоймецеся распрацоўкай новай стратэгіі для завявання чарговай асабістай вяршыні. Можа паўстаць пытанне аб пераходзе на новую перспектыўную работу. У аўторак павялічацца творчы патэнцыял і працаздольнасць, што дазволіць з лёгкасцю справіцца з задачай любой складанасці. У пятніцу могуць з'явіцца новыя сябры. У суботу можа рэалізавацца мара пра падарожжа.



**ЛЕЎ.** Паспрабуйце рацыянальна размяркаваць сілы на ўвесь тыдзень. Поспех будзе спадарожнічаць у пошуках работы і афармленні дакументаў. Творчасць — свая ці чужая — дазволіць захаваць аптымізм. Тыдзень можа стаць падмуркам для далейшага кар'ернага ўзлёту. Аднак давядзецца стаць больш падатлівымі і дыпламатычнымі з начальствам. У панядзелак магчыма выкананне нават неверагодных жаданняў. У сераду пажадана звярнуць увагу на ўзаемаадносіны ў сям'і. Дзеці запатрабуюць асаблівага клопату.



**ДЗЕВА.** Вакол вас будзе сканцэнтравана мноства новых думак, ідэй і планаў, некаторыя з іх могуць падацца вам вар'яцкімі. Аднак лепш не спяшацца з высновамі. Немалую ролю ў з'яўленні гэтых ідэй могуць сыграць вашы сябры, заразіўшы сваім прыкладам, прычым самі яны хуценька сыдуць у цень. У гэтай сітуацыі варта ўключыць інтуіцыю і цвярозы розум, каб не патрапіць у непрыемнасці. Аднак, калі вас нішто не бянтэжыць, смела рухайцеся наперад. Магчыма, атрымаецца адным рыўком пераадолець шматлікія перашкоды, якія стаяць на шляху.

## наступны тыдзень



**ШАЛІ.** Пачатак тыдня прынясе выдатны настрой, але запатрабуе добра папрацаваць. Для рэалізацыі запланаванага не звяртайцеся да ціску на навакольных, інакш усё можа павярнуцца супраць вас саміх. Жыццё падрыхтавала вам некалькі крутых паваротаў, не варта пазбягаць іх і спрабаваць пракласці шлях наўпрост ці яшчэ горш — адступаць назад. У сераду і чацвер прыглядзецеся да «падводных плыняў» на рабоце, каб не апынуцца ў баку ад самых важных падзей. У нядзелю не варта ігнараваць просьбы родных і блізкіх людзей, таму што ваша падтрымка ім сапраўды патрэбна.



**СКАРПІЁН.** У вашым жыцці наступае світанак, намячаецца становучая перспектыва ў справах, з'яўляюцца новыя магчымасці для рэалізацыі сябе. Жадаючы навучыцца чаму-небудзь, пазнаёмцеся з чалавекам, які добра ўмее гэта рабіць. Зараз выдатны час, каб запісацца ў аўташколу ці на курсы англійскай. У панядзелак нечаканы паварот падзей адкрые перад вамі новыя магчымасці. У аўторак вас можа наведаць творчае натхненне. У чацвер загружанасць справамі прымусіць перанесці дзелавыя перамовы. У пятніцу назначце сустрэчу сябрам. У выхадныя вас чакаюць новыя прыемныя ўражанні.



**СТРАЛЕЦ.** Гэты тыдзень можа апынуцца поўным на спакусы. Не выключана, што вас паспрабуюць падмануць ці выкарыстаць. У чацвер паспрабуйце не пазбягаць складанай размовы ў сям'і або на рабоце. Не варта хаваць галаву ў пясок, важна разабрацца ў праблеме. Але не бярыце на сябе дадатковых абавязацельстваў. Цягам тыдня пажадана пастарацца прыцішыць свае амбіцыі, інакш ваш аўтарытэт можа пахіснуцца. У пятніцу будзьце ўважлівымі ў расходах, але паспрабуйце па магчымасці не адмаўляць родным у фінансавай падтрымцы.



**КАЗЯРОГ.** Надыходзіць спрыяльны перыяд у многіх галінах і кірунках. Аднак цяпер не час спачываць на лаўрах. Вам трэба развіваць поспех, рухацца далей. Другая палова тыдня будзе напоўнена працай ва ўсіх сэнсах. У выхадныя сямейныя свята захопіць вас у свае абдымкі і закруціць у танцы. У нядзелю варта трохі адыхацца і адпачыць ад мітусні — напрыклад, зладзіць сабе маленькае падарожжа або шпацыр.



**ВАДАЛЕЙ.** На гэтым тыдні ў вас можа з'явіцца магчымасць заняцца новым відам дзейнасці. Самы час запісацца ў спартзалу, завесці новыя знаёмствы, знайсці хобі. У сераду і чацвер паспрабуйце не ствараць сабе праблем, палічыўшы любую дробязь, якая не вартая ўвагі, непераадольнай перашкодай. Паспрабуйце засяродзіцца на тым, што тычыцца вашых інтарэсаў і аддаціце назойлівыя думкі. У суботу праявіце ўвагу і такт пры зносінах з блізкімі.



**РЫБЫ.** Тыдзень дазволіць парадавацца поспехам блізкіх людзей. Вам будзе неабходна ўсвядоміць падзеі і перамены на рабоце. Абапірайцеся на прынцыпы і перакананні, якія пераважаць сумнўную імгненную выгаду. У панядзелак непажадана канфліктаваць з навакольнымі з-за дробязяў. У аўторак будзьце ўважлівыя, не прапусціце цікавай інфармацыі. У сераду лепш не распачынаць нічога сур'ёзнага. У чацвер будуць удалыя паездкі і камандзіроўкі. У суботу парадуйце блізкіх чымсьці смачненькім.

## Чацвер, 10 лістапада

### Беларусь 1

**6.00, 7.20, 8.15** Добрай раніцы, Беларусь!
**7.00, 8.00, 9.00, 12.00, 15.00, 19.00, 0.30** Навіны.
**7.05, 8.05** Навіны эканомікі.
**7.10, 8.10, 19.40, 23.55** Зона Х.
**9.10, 22.15 Серыял «След».**
**10.00, 13.00, 16.00** 90 секунд.
**11.00, 20.00 Серыял «Жаночы доктар-2».**
**12.10, 16.30 Серыял «Сямейныя меладрамы-6».**
**13.20** Дзень у вялікім горадзе.
**14.20** Дзіцячы доктар.
**15.15, 18.40** Навіны рэгіёна.
**15.25 Серыял «Залатая краіна».**
**17.35** Беларуская часінка.
**19.20, 0.10** Сфера інтарэсаў.
**21.00** Панарама.
**21.45** Буйным планам.
**0.50** Дзень спорту.
**1.00 Серыял «Гетэры маёра Сакалова».**

### Беларусь 2

**7.00** Тэлераніца.
**9.00, 22.10** Тэлебарометр.
**9.05, 23.15** «Анлайн 2.0». Скетчкам.
**9.30, 18.40 Дэтэктыў «Такая работа».**
**10.20, 20.55** «Экстрасэнсы-дэтэктывы».
**11.20, 17.05 Серыял «Мая цудоўная нянька».**
**11.55, 17.35 Серыял «Не нарадзіся прыгожай».**
**12.45, 19.35** «Ікона стылю». Fashion-шоу.
**14.05** «Каханне анлайн». Рэаліці-шоу.
**15.20** «Пін_код». Інтэрактыўны маладзёжны праект.
**16.00, 22.15 Дэтэктыў «Трынаццаць».**
**22.00** Спортлато 6 з 49, КЕНО.
**23.45 Серыял «Як я сустрэў вашу маму».**

### Беларусь 3

**7.00** «Дабрананак».
**7.35, 11.55** «Беларуская кухня». Грачанікі.
**8.05, 11.15, 21.00** «Калейдаскоп». Навіны культуры.
**8.20, 18.00 «Дастаеўскі». Драма, заключная серыя.**
**9.20** «Гэта твой дзень». Фільм — дзецям.
**10.50** «Святло далёкай зоркі». Памяці дырыжора, народнага артыста СССР Віктара Роўды.
**11.35** «Край».
**12.25** «Размаўляем па-беларуску».Тэлевіктарына.
**13.00** «Рэпартаж са свету раслін». Навукова-папулярны фільм.
**13.15, 21.25 «Вядзьмарка». Драма.**
**14.50, 20.00** «Стаўка». «Пералом».
**15.30 «Кахаць па-руску 3. Губернатар». Меладрама.**
**17.10, 23.00** «Дыя@блог». Пра літаратуру.
**17.35** «У гасцях у Барыса Аверына».
**19.00 «Гвяздзік». Драма.**
**20.40** «Калыханка».
**21.20** «Час кіно».

### Беларусь 5

**8.00, 19.00, 22.00** PRO спорт. Навіны.
**8.10** Слэм-данк.
**8.40** Хакей. КХЛ. «Дынама» (Масква) — СКА (Санкт-Пецярбург).
**10.35** Футбол. Ліга чэмпіёнаў УЕФА. 4-ты тур. «Манчэстэр Сіці» — «Барселона».
**12.40** Хакей. Кубак Дружбы-2016. Беларусь (U-18) — Германія (U-18).
**14.35** Хакей. Кубак Дружбы-2016. Беларусь (U-18) — Славакія (U-18).
**16.30** Футбол. Таварыскі матч. Грэцыя — Беларусь.
**18.25** Фактар сілы.
**19.10** Авертайм. КХЛ.
**19.25** Хакей. КХЛ. «Дынама-Мінск» — «Куньлунь РС» (Кітай). (У перапынку — Авертайм. КХЛ).
**22.10** Баскетбол. Еўраліга. «Панацінаікас» (Грэцыя) — «Макабі» (Ізраіль).

### АНТ

**6.00, 6.30, 7.00, 7.30, 8.00** (з субцітрамі), **8.30, 9.00** (з субцітрамі), **11.00, 13.00, 16.00, 18.00** (з субцітрамі), **20.30** Навіны.
**6.05, 8.05** «Наша раніца».
**9.05** «Жыць здорава!»
**10.25** «Кантрольная закупка».
**11.05, 13.05, 16.15, 18.15** (з субцітрамі), **21.00** Навіны спорту.
**11.10** «Модны прыгавор».
**12.10** «Сам-насам з усімі».
**13.10** «Мужчынскае/Жаночае».
**14.10** «Пра каханне».
**15.10, 16.20** «Час пакажа».
**16.55** «Давай пажэнімся!»
**18.20 Серыял «Татавы дочкі».**
**18.50** «Няхай гавораць».
**20.00** Час.
**21.05** «Трэба разабрацца».
**21.30 Серыял «Таямнічая страсць».**
**23.20** «Вячэрні Ургант».
**23.55 Серыял «Агент нацыянальнай бяспекі».**
**1.30** Начныя навіны.

### СТБ

**6.00, 7.30, 10.30, 13.30, 16.30, 19.30, 22.30** «24 гадзіны».
**6.10, 17.25** «Міншчына».
**6.20, 7.45** «Раніца. Студыя добрага настрою».
**7.40, 20.10, 22.55** «СТБ-спорт».
**8.30, 23.25** «Тайны Чапман».
**9.30, 18.35** «Самыя шакіруючыя гіпотэзы».
**10.40** «Сямейныя драмы».
**11.35** «Не хлусі мне!»
**12.35, 17.35** «Званая вячэра».
**13.50** «Сакрэтныя тэрыторыі».
**15.40 «Следакі». Серыял.**
**16.10** «Скардзіцца дазваляецца».
**16.50** «Мінск і мінчане».
**20.00** «Сталічныя падрабязнасці».
**20.15** «Дзіўная справа».
**22.00** «Глядзець усім!»
**23.05** «Аўтапанарама».
**0.20 Маст. фільм «Вернемся восенню».**

### МІР

**6.00** М/ф.
**7.00** «Экстрасэнсы. Па той бок іншага свету».
**7.30** Добрай раніцы, свет!
**9.00 Маст. фільм «Мама выйшла замуж».**
**10.30 Маст. фільм «Флэшка».**
**12.30** «Цяжар абеду».
**13.00, 16.00, 19.00** Навіны (бягучы радок).
**13.15, 19.20 Серыял «Пад прыкрыццём».**
**16.10** Ток-шоу «Слова за слова».
**17.05 Серыял «Атрад».**
**22.00 Маст. фільм «Калачы».**
**23.35 Маст. фільм «Таямнічая карта».**
**2.05 Серыял «Невідзімкі».**

### РТР—Беларусь

**7.00** «Раніца Расіі».
**11.00, 14.00, 17.00, 20.00** Весткі.
**11.35** «Пакой смеху».
**12.00** «60 хвілін». Ток-шоу.
**13.15** «Правілы жыцця».
**13.50, 16.50, 19.50, 23.00** Навіны — Беларусь.
**14.35** «Пра самае галоўнае». Ток-шоу.
**15.40** «Прамы эфір».
**17.20 Серыял «Сваты».**
**19.10, 20.40 Серыял «Касатка».**
**21.45, 23.10** Канцэрт, прысвечаны Дню супрацоўніка органаў унутраных спраў Расійскай Федэрацыі. Трансляцыя з Дзяржаўнага Крамлёўскага Палаца.
**23.35** «Простыя пытанні» з Ягорам Хрусталёвым.
**23.55** «Паядынак».

### НТБ—Беларусь

**5.55** «Астрапрагноз».
**6.00** «Новая раніца».
**7.30** «Студыя Юліі Высоцкай».
**8.10 Серыял «Вяртанне Мухтара».**
**10.00, 13.00, 16.00, 19.00** Сёння.
**10.25 Серыял «Ляснік».**
**12.00** Суд прысяжных.
**13.25, 23.05** Агляд. Надзвычайнае здарэнне.
**14.05 Серыял «Урачэбная тайна».**
**16.25 Серыял «Вуліцы разбітых ліхтароў».**
**18.05** «Гаворым і паказваем». Ток-шоу.
**19.40 Серыял «Брат за брата».**
**23.30** «Вынікі дня».
**0.00** «Вялікія бацькі». Папанаў.

### 8 канал

**6.30** Раніца на «Восьмым».
**11.00 Камедыя «Цацка».**
**12.30** Дак. серыял «Скрозь прастору і час».
**13.15 Серыял «Цяжкі пясок».**
**14.05 Драма «Дзве жанчыны».**
**15.55, 19.05, 21.05, 23.55** «На двор'е».
**16.00** «Мультпарад».
**16.30** «Мой любімы гадаванец».
**17.00 Серыял «Крык савы».**
**18.00, 19.10, 21.00** «Хатняя крама».
**18.05 Серыял «Чалавек у высокім замку».**
**18.55** «Фэшн is my прафэшн».
**19.15 Серыял «На ўсе застаўкі».**
**20.50** «Вечарніца».
**21.10** «Даведнік па краінах і кантынентах».
**21.20 Трылер «Апантанасць».**
**23.05 Серыял «Закон і парадак».**

### ВТБ

**6.00, 17.00** «Турбаміксер».
**7.00** М/ф «Смяшарыкі».
**7.20** М/ф «Фіксікі».
**7.50** М/ф «Маша і мядзведзь».
**8.10** «Ералаш».
**8.30, 18.00** Серыял «Варонiны».
**9.40** Баявік «Ямакасі, або Новыя самураі».
**11.40, 14.40, 19.10** Серыял «Кухня 5».
**12.50** «Паспець за 24 гадзіны».
**14.00** Серыял «Два бацькі, два сыны 3».
**15.50, 20.20** Серыял «Маладзёжка 5».
**21.30** Драма «Залегчы на дно ў Бругге».
**23.50, 3.30** Скетч-шоу «6 кадраў».
**0.00** Еўрапейскі покерны турнір.
**0.50** Серыял «Бязмоўны сведка».
**3.00** «Дурні і дарогі».
**4.00** «Лаві момант».
**4.30** Скетч-шоу «Даеш моладзь».
**5.00** Скетчкам «Студэнты».
**5.30** «Мільёны ў сетцы».

### Культура

**6.30** «Еўраньюс».
**10.00, 15.00, 19.30, 23.30** Навіны культуры.
**10.15, 1.55** «Назіральнік».
**11.15, 23.50** «Каломба». Серыял.
**12.55, 20.45** «Правілы жыцця».
**13.20** «Расія, любоў мая!» «Каракскія традыцыі».
**13.50** «Авадзень». Маст. фільм. 3-я серыя.
**15.10** Да 95-годдзя Тэатра імя Яўг. Вахтангава. Юрый Якаўлеў, Мікалай Грыцэнка, Людміла Максакава, Ала Казанская ў спектаклі «На всякого мудреца довольно простоты». Запіс 1971 года.
**17.50** «Эпізоды». Ала Казанская.
**18.30** Гістарычныя канцэрты. Артур Рубінштэйн.
**19.15** «Добрай ночы, малыя!»
**19.45** Галоўная роля.
**20.05** Чорныя дзіркі. Белыя плямы.
**20.45** Аляксей Сіманаў «Кавалачкі жыцця... Леанід Уцёсаў».
**21.15** «З песняй па жыцці. Леанід Уцёсаў». Дак. фільм.
**22.15** «Культурная рэвалюцыя».
**23.00** «Сачыненне жыцця». Дак. серыял.
**23.45** Мастсавет.
**1.25** Фабіа Мастранджэла і сімфанічны аркестр «Руская філармонія». Творы А. Барадзіна, І. Стравінскага, А. Хачатурана.

### Настальгія

**6.00** «Эліта Краіны Саветаў». Дзмітрый Язаў. 2007 год.
**6.50, 8.40, 9.40, 11.00, 11.45, 12.50, 14.40, 15.40, 17.00, 17.30, 19.05, 20.45, 21.40, 23.00, 23.30, 1.05, 3.40, 5.00, 5.35** Музычная настальгія.
**7.10** Маст. фільм «Дзікі сабака Дынга».
**9.00, 15.00, 21.00, 3.00** «Мінулы час».
**10.00, 16.00, 22.00, 4.00** «Народжаныя ў СССР».
**11.20** Дак. фільм «Вялікі містыфікатар».
**12.00** «Быў час» з Аляксандрам Паліткоўскім: «Школа мастацтва часоў СССР». 2007 год.
**13.10** Тэлеспектакль «Гульцы». 1978 год.
**17.20, 23.20** «Мастак і паэт Міхаіл Гробман чытае свае вершы». 2005 год.
**18.00** «Яловая субмарына» з Аляксандрам Ліпніцкім: «Гісторыя рускага рока». «Звуки Му». 2-я частка. 2006 год.
**19.35** Фільм-спектакль «Юнона і Авось». Пастаноўка Маскоўскага тэатра імя Ленінскага камсамола. 1983 год.
**0.00** «СевАлогія» з Севам Наўгародцавым: «Ролінг Стоўнз». 2005 год.
**1.15** Маст. фільм «Дажывём да панядзелка».
**5.20** Дак. фільм «Другая пятачка».

### EuroSport 1

**4.15, 8.45, 12.45, 16.15, 22.30** Горныя лыжы. Кубак свету. Мужчыны.
**5.00, 2.05** Баявыя майстэрствы. Суперкомбат.
**6.30, 18.00, 3.30** Лёгкая атлетыка. Марафон.
**8.00, 12.00, 15.30, 22.05** Горныя лыжы. Кубак свету. Жанчыны.
**9.30, 14.00, 23.00** Футбол. Чэмпіянат MLS. Плэй-оф.
**10.30** Фігурнае катанне. Этап Гран-пры. Кубак Расіі.
**13.30** Футбол. Чэмпіянат MLS.
**17.00** Watts.
**19.45, 0.30** Футбол. Таварыскі матч. Маладзёжныя зборныя (U-21).

### Кінакамедыя

**0.30** Меладрама «Каханне і іншыя катастрофы».
**2.15** Камедыя «Дом з паранармальнымі з'явамі».
**3.35, 14.00, 14.45, 15.35** Скетчкам «Паміж намі».
**4.00** Меладрама «Спатканне ўсляпую».
**5.45** Камедыя «Канікулы мары».
**7.25** Меладрама «Спачатку каханне, потым вяселле».
**9.00** Камедыя «Бінга-Бонга».
**10.50** Камедыя «Ні хвіліны спакою».
**12.15** Камедыя «Усё пуцём!»
**14.15, 15.05** «Камедыянты (Шоу)».
**16.00** Камедыя «Загадана жаніць», 1-я серыя.
**16.50** Камедыя «Загадана жаніць», 2-я серыя.
**17.50** Камедыя «Дазвольце цябе пацалаваць... Бацька нявесты».
**19.30** Меладрама «Каханне з перашкодамі».
**21.25** Меладрама «Пенелопа».
**23.15** Меладрама «Вялікая маленькая Я».

### ТБ3

**6.00** М/ф.
**7.55** «Доктар I...»
**8.25, 18.50, 2.50** «Асколкі». Серыял.
**10.00, 4.25** «Судовыя страсці». Дак. серыял.
**11.45** «Сляпая».
**12.45** «Варажбітка».
**13.50** «Паралельны свет».
**14.50** «Ёсць адзін сакрэт».
**15.20** «Здзелка».
**15.50** «Магазіна».
**16.50, 21.45** «Рэвізора».
**17.50** «Тайны следства». Серыял.
**20.45** «Паненка-сялянка».
**22.50, 2.00** «Вялікія пачуцці».
**23.25** «Звышнатуральнае». Серыял.
**0.10** «Эфект матылька». Трылер.

### ТБ1000

**6.10, 18.15** Трылер «Экстрасэнс».
**8.10** Драма «Падмена».
**10.35** Драма «Галгофа».
**12.20** Драма «Вялікія вочы».
**14.15** Драма «Бачнасць гневу».
**16.20** Трылер «Лофт».
**20.10** Драма «Яшчэ адна з роду Балейн».
**22.10** Драма «Дваццаць адно».
**0.25** Драма «Сцежкі».
**2.30** Вестэрн «Апалуза».
**4.45** Меладрама «Адна сустрэча».

### ТБ1000 Рускае кіно

**6.20** Драма «Дуэль. Пушкін — Лермантаў».
**9.00** Драма «Мой зводны брат Франкенштэйн».
**11.00** Камедыя «Уцячы, дагнаць, заказацца».
**12.30** Трагікамедыя «Майстэрства жыць у Адэсе».
**14.20** Драма «Географ глобус прапіў».
**16.30** Драма «Арэлі».
**18.10** Баявік «Паляванне на піранню».
**20.20** Камедыя «Каўказская палонніца!»
**22.10** Прыгоды «Сляды апостала».
**0.20** Баявік «Іерэй-сан. Споведзь самурая».
**2.20** Трагікамедыя «Коля — Перакаці поле».
**4.30** Камедыя «Усё ўключана 2».

### National Geographic

**6.00, 12.35, 20.15** Гульні розуму.
**6.45, 13.20, 5.10** Навуковыя недарэчнасці.
**8.00, 14.10, 21.00, 0.50, 3.40** Ледзяная дарога.
**8.45, 14.50, 21.50, 1.40, 4.25** Шаша праз пекла.
**9.35, 17.10** Сапраўдны суперкар.
**10.20, 18.00** Аўта-SOS.
**11.05, 22.30** Дзікі тунец.
**11.50, 15.40** Міжнародны аэрапорт Дубай.
**16.25, 19.30, 23.20, 2.50** Расследаванні авіякатастроф.
**18.40** Погляд знутры.
**0.00** Паранармальнае.
**2.20** Твар у твар.

### Discovery

**8.00, 14.00** Аляска: сям'я з лесу.
**9.00, 15.30, 21.30, 5.55** Як гэта ўстроена?
**9.30, 15.00, 21.00, 5.30** Як гэта зроблена?
**10.00, 16.00, 23.00, 7.10** Паляўнічыя на рэліквіі.
**10.30, 16.30, 23.30, 7.35** Багажныя войны.
**11.00** Дальнабойшчыкі.
**12.00, 0.00, 3.50** Залатая ліхаманка.
**13.00** Смяротны ўлоў.
**17.00, 22.00, 2.55** Махінатары.
**18.00** Пяцёрка найлепшых.
**1.00, 6.20** Што было далей?
**1.30, 6.45** Звышчалавечая навука.
**2.00, 4.40** Самагоншчыкі.

■ Валянцінкай

# ЗОЛАТА ХРЫЗАНТЭМ

*...Пасля разводу бацькоў радні ў гэтага дзіцяці амаль не засталося: мама ды адна бабуля. Шматлікія цёткі і дзядзькі, стрыечныя брацікі і сястрычкі, а галоўнае, другая бабуля і тата засталіся ў мінулым. Мама не хацела бачыцца з імі і рабіла ўсё, каб не бачылася дачка. Малая спачатку плакала: па некалькі разоў на дні пыталася, дзе ж яе тата, чаму ён не ідзе дадому і калі ўжо скончыцца тая камандзіроўка?..*

*А бацька — як потым дазналася — нікуды не ездзіў, ён побач быў, штовечар хадзіў пад вокнамі, прывозіў ёй падарункі, угаворваў былую жонку дазволіць сустрэчы, «купляў» у яе ж спатканні (хоць зрэдку), хадзіў у суды. А ўрэшце — стаміўся і здаўся. Вырашыў: падрасце дзіця і, дасць Бог, усё зразумее.*

*Хутка падрасло. Цяпер — спрабуе зразумець.*

Надоечы ўпершыню ў дарослым жыцці да другой бабулі з'ездзіла: бацька папрасіў, каб лекі завезла.

Першая думка была — адмовіцца, сказаць, што лепш бы некалі разам, бо яна ж сто гадоў той бабулі не бачыла, не помніла, дзе жыве. Да таго ж — гэта ўвосень, у вёску.

А з іншага боку... Уявіла бабулю — хворую, якой даўно ўжо не 40, і не на жарт спужалася: згадзілася везці лекі (тым больш што бацька і машыну даваў...). Значыць, яна тады мігам — туды і назад.

...Бабуля, нягледзячы на хваробу, сустрэла яе ля весніц. Заплакала, моцна абняла, за руку — нібы не верачы, што трымае, ці баючыся, што тая вырвецца, — павяла ў сваю хату. Прыняла ад унучкі гасцінцы ды лекі, прыціснула іх да грудзей і, здаецца, не міргаючы глядзела, як яе госця выглядае, як распранаецца, як папраўляе прычоску.

Потым — стала паказваць дом. Найперш павяла ў прасторную залу, дзе па-ранейшаму («Усё, як тады!» — прызнала ўнучка) стольп падпіралі рагатыя фікусы і горы падушак (большыя, меншыя, зверху маленькія) у вышытых навалочках, дзе на покуці віселі абразы, а на сценах — партрэты сваякоў.

Аднак расказваць пра іх бабуля не стала: запрасіла на кухню, пасадзіла за стол, кінулася частаваць яе «ўсім сваім» (толькі што адкінутым тваражком, кумпячком, аладкамі, духмяпай гарбузовай кашай і гарбатай) і распытваць пра жыццё.

Пакуль госця расказвала ды каштавала, на двары пакрысе цямнела.

— Мне ж пара, — спахапілася раптам унучка.

— Божухна, куды? — спужалася гаспадыня. — Як быццам, у хаце месца няма!.. Ёй трэба ляцець, на ноч глядзячы... Навошта? Дзеці ж дома не плачуць?

— Не, — усміхнулася ўнучка.

— Значыць, заставайся. Маме пазвоніш, скажаш, што заўтра прыедзеш. А сёння — пабудзь яшчэ, мы з табой хоць пасядзім, пагутарым, я табе пра ўсіх раскажу, а потым — дом жа вялікі, пакояў шмат. Я табе ў зале паслала, як некалі, помніш?



Той шырокі ложак пад фікусам унучка, вядома ж, помніла: яны з мамай спалі на ім, а раніцай з'яўляўся тата і пачынаў будзіць сваіх «спячых прыгажунь».

Яны яшчэ доўга дурэлі тады, смяяліся, але ж гэта было даўно, у дзяцінстве.

Цяпер жа тая «малая», прывыкляя да цяпла, дрэнна ўяўляла, як у зале раздзецца (там халаднавата), як потым легчы і як, калі спатрэбіцца, ноччу ўстаць?!

...Яшчэ і з-за гэтага яны з бабуляй доўга сядзелі на канапцы ў кухні, грызлі гарбузікі, глядзелі карткі, размаўлялі. Не заўважылі, што час праляцеў: 12 ночы, трэба ж класціся спаць!

Пайшлі ў залу. З тога «стога» ўнучка выбрала сабе падушку.

— Потым дамоў яе забярэш... На памяць, — сказала бабуля. — І вось гэту кашульку з сабою возьмеш. Не бойся — новенькая. Для цябе купіла. І зранку да печкі павесіла, каб цёпленькая была. Так што адзявай, дзіцятка, і дабранач табе.

Пакінуўшы гэта пажаданне, гаспадыня сышла ў бакоўку, унучка засталася ў зале. Спехам, бо зябка (бабуля казала, што не любіць лішняга цяпла — ёй трэба, каб халаднавата было), раздзелася, мігам ускінула на сябе кашульку — сiганула пад коўдру і сама сабе не паверыла: там было... цёпла, мякка, утульна. «Пад бокам, мусіць, нейкая грэлка? А зверху — пуховая коўдра ці што?» — сама ў сябе папыталася госця і адказаць не паспела, бо тут жа (абы галава да падушкі) правалілася ў сон — салодкі, глыбокі, моцны...

Прачнулася ці не ў тыя ж 12. Дня. Носам злавіла водар бліноў, пачула, як на кухні паляпвае патэльня, патрапала за вушы соннага катка, што ўсю ноч, відаць, «пільнаваў» яе сон, гучна — аж ложак зарыпеў — пацягнулася.

— Ну, ці выспалася, золатка маё? — з кухні спытала бабуля.

— Ой, як ніколі ў жыцці!.. Зараз, здаецца, горы звярну!

— Давай, даражэнькая! На чарзе аж тры штукі.

Праз адчыненыя дзверы ўнучка і сапраўды ўбачыла стол з ладнай горкай бліноў, з поўнымі (з коптурам) міскамі масла і тварагу, са слоічкамі смятаны і варэннем на выбар...

— Слухай, бабуля, а ты не хочаш свой бізнес адкрыць? — спытала ўнучка хвілін праз колькі займаючы месца на канапцы.

— Гэта ж які?

— Ды звычайны: за кожную ноч на тваёй пярыне ды пад гэткай коўдрай неблагія грошы можна ўзяць... А калі яшчэ і са снеданнем...

— Як гэта?

— Ды ўсё проста: даём аб'яву, чалавек прыязджае...

— А дзіцятка маё, — не даслухала яе бабуля, — ды пабойся Бога! Як жа гэта — чалавек да мяне прыязджае, а я з яго грошы бяру?!

— Ну вось, — засмяялася ўнучка, — не лёс мне рэкламай зарабіць! «Накрыўся» наш бізнес так і не адкрыўшыся... А можна было б закруціць...

— Ты еш давай ды зараз шалік закручвай: пойдзем з табою ў сад, насыплем у багажнік найлепшых яблычак, дадому завязеш, сваіх пачастуеш. А горшыя, калі хочаш, кароўцы занясём...

Уразіў унучку той сад — вялізны, стары, яшчэ прадзедаў.

Спадабалася з далонькі карміць карову і накрываць пад вокнамі ружы...

А найбольш, відаць, усміхацца людзям, следам за бабуляй казаць ім, што яна і сапраўды Мішава дачка, што прыехала вось — нарэшце...

Дамоў ад'язджала толькі пад вечар і музыку гэты раз не ўключала — зусім: успамінала бабулін дом, іх размовы і сад, дыхала водарам жоўтых хрызантэм, што ляжалі побач, час ад часу азіралася на заднее сядзенне, дзе ўзвышалася бабуліна падушка, і міжволі ўспамінала бацькава: «У вёску з'ездзіў, як у лазню схадзіў, — да наступнай чысты».

Парушаць гэту чысціню дачцэ не 'хацелася. Да таго ж яе ўсю дарогу да горада не адпускала балючае адчуванне, што некалі, гадоў з 15 таму, яе страшэнна абакралі. І толькі цяпер тое дабро пачынаюць вяртаць — золатам хрызантэм.

**Валянціна ДОЎНАР.**
*dounar@zviazda.by*

■ Неасабісты суб'ектыў

# Зацярушанае восеньскім снегам



### Што засталося недапісаным у артыкуле дзевятнаццацігадовай даўнасці

Я вельмі не люблю ранні восеньскі снег. Зусім не таму, што ён падобны на няспраўджаныя надзеі — пасля радаснага светлага прадчування застаецца мокрая брудная рэчаіснасць. І не таму, што шкада залатых бяроз, якія не паспелі скінуць лісце, і крамяных яблыкаў у садзе, якія, здаецца, яшчэ больш чырванеюць ад нечаканай халоднай навалы. Прычына тут зусім іншая, і мае, так бы мовіць, абсалютна чалавечы характар.

Я нават памятаю дакладную дату, калі гэта мая нелюбоў пачалася. 31 кастрычніка 1997 года. Цэлы дзень тады давялося трэсціся ў дарозе, вяртаючыся з камандзіроўкі. Спачатку ў халодным дызелі з Быхава да Магілёва, пасля ў гэткім самым халодным «Ікарусе» з Магілёва на Мінск. Увесь час на шыбы ляпіўся густы снег, павольна спаўзаў па іх, пакідаючы брудныя пісагі. Усё вакол было белае, і толькі бярозавыя гаі на пагорках упарта свяціліся з-пад снегу яркімі паходнямі...

Было прыгожа і светла, але ўсе гэтыя краявіды праносіліся міма і бадай упершыню ў жыцці не кранalі душу аніяк. З галавы не ішло пачутае і ўбачанае ў невялікай аднапакаёўцы на ўскраіне Быхава, што мелася стаць тэмай для матэрыялу. Упершыню ў жыцці я тады сутыкнулася з такім перакручаным чалавечым лёсам, з такой нявыплаканай чалавечай тугой.

НАВАТ сёння, праз дзевятнаццаць гадоў, мне не трэба гартаць падшыўку, каб успомніць, як звалі тую маю гераіню. Яе імя — Ганна Вікенцьеўна Драўгяліс-Палеўская. Маленькая худзенькая бабуля ў зацыраваным кофце і акулярах з адной паламанай дужкай. Ёй тады было 84 гады. У яе кватэры амаль не было мэблі, туды амаль ніколі не заходзілі людзі, толькі сацыяльны работнік, бабуля была самотная і адзінокая — у яе тут не было ніводнай роднай душы.

Падчас вайны яе разам з іншымі маладымі людзьмі з Рудзенска пагналі на прымусовыя работы ў Германію. Вызвалілі іх амерыканцы, і, па маладой дурноце, яна апынулася сярод соцень мігрантаў за акіянам. Не ведаючы мовы, не маючы знаёмых, сербанула там чужынскага «шчасця» напоўніцу. Пасля, здавалася, лёс зміласціўся: сустрэлася з гэткім самым разгубленым і адзінокім (ён трапіў у нямецкі лагер з Украіны, адтуль — гэтак жа, як і яна, — у Амерыку). Пабраліся шлюбам, пераехалі ў Канаду, нарадзілі хлопчыка — позняе, доўгачаканае, любімае дзіця. Здавалася б, што яшчэ трэба? Але ёй вельмі хацелася дадому, праведаць старэнькую маці, якая дажывала свой век у Быхаве. Якраз была «адліга», і Ганна, без асаблівых праблем атрымаўшы візу, пакінуўшы сямігадовага сына на мужа, паехала ў сваё падарожжа, якое зацягнулася на ўсё астатняе жыццё.

Бо пакуль яна займалася ў Быхаве афармленнем патрэбных дакументаў, пакуль разбіралася з матуліным пакойчыкам у бараку (маці памерла за некалькі дзён да яе прыезду), грымнуў карыбскі крызіс, «жалезны занавес» зноў з грукатам шчыльна зачыніўся. Ганну, былую савецкую грамадзянку, з краіны проста не выпусцілі. Яна абабіла ўсе парогі, ездзіла нават у Маскву, але нічога не дабілася. Так і засталася ў тым бараку без грошай, без знаёмых, без сваякоў. Без сувязі з роднымі за акіянам — яе пісьмы ім не даходзілі, адзінае пісьмо адтуль, якое атрымала праз пяць ці шэсць гадоў пасля ад'езду, было ад адваката — ён паведамляў аб намеры мужа развесціся. Дні, месяцы, гадыператварыліся ў суцэльны шэры змрок. Памерці ў галечы ёй не далі — з наступленнем узросту сталі плаціць мінімальную пенсію, калі знеслі барак — выдзелілі аднапакаёвы катушок у панэльным доме. Сведчаннем аб тым, што сям'я не была прымроеным сном, у яе засталася толькі картачка сына, якую заўсёды насіла з сабой...

КАЛІ прыйшла перабудова, калі стала магчымым даведацца пра лёс родных людзей, ёй было ўжо за семдзесят, і не было ўжо ні сіл, ні здароўя, ні ўяўлення, што і як рабіць, з чаго пачынаць. Навакольныя лічылі яе «шпіёнкай», у кватэры не было тэлевізара — адкуль ёй было ведаць? Ужо ў 97-м мой калега пазнаёміўся з гэтай бабуляй зусім выпадкова. Пачуўшы яе гісторыю, спачатку не паверыў, пасля паглядзеў фота, дакументы — і жахнуўся. Патэлефанаваў мне: «Слухай, тут такая тэма ёсць!»

Тады мой артыкул і праўда пахвалілі, як вельмі ўдалы. Мы спрабавалі дапамагчы Ганне Вікенцеўне — пачалі шукаць яе дарослага сына. І — знайшлі, але атрымалася не памач, а немач. Мужчына аказаўся паталагічна пакрыўджаным на маці, якая, як лічыў, кінула яго малога (зрэшты, а як ён мог лічыць яшчэ?). Да таго ж быў ён нетрадыцыйнай арыентацыі, не меў у Амерыцы нават уласнага жылля — перазязджаў са сваім бойфрэндам па краіне ў нейкім трэйлеры... Яшчэ адзін пакручаны лёс — і больш нічога. Пра тое, каб забраць маці да сябе ці проста прыехаць яе праведаць, — не было нават гаворкі...

Ганна Вікенцеўна так і не дачакалася. Я ўспамінаю яе кожны раз, калі ў кастрычніку ці на пачатку лістапада пачынае ісці ранні мокры снег, які я вельмі не люблю з таго часу, як з'ездзіла ў Быхаў і напісала той удалы матэрыял.

ПРАЎДА, не такі ён і ўдалы. Бо не напісала тады, па маладой дурноце, галоўнае. Пра тое, як лёс простых людзей залежыць ад тых, хто хоча ваяваць. Ад тых, хто хоча даказаць сваю перавагу на гэтым блакітным шарыку. Ад тых, хто не можа і не хоча зразумець, што жыццё кожнага асобна ўзятага чалавека — найвялікшая і недакранальная каштоўнасць, і распараджацца ёй мае права толькі сам чалавек...

Зрэшты, паглядзела сёння выпуск навін па тэлебачанні, паблукала па Сеціве — і зразумела: з гэтымі высновамі я не спазнілася. Праўда, ні ад гэтага, ні ад таго, што першы падманлівы снег растаў і нават сонца праблісквае, лягчэй чамусьці не стала.

**Алена ЛЯЎКОВІЧ.** *alena@zviazda.by*

■ Святыні

# У БАЦЬКОЎСКУЮ СУБОТУ

**У Дзімітрыеўскую (бацькоўскую) суботу беларусы могуць пакланіцца правіцы (правай руцэ) вялікапакутніка Дзімітрыя Салунскага, у імя якога названа свята. У пятніцу вечарам святыню прывозяць з Грэцыі ў Мінск, дзе яна прабудзе да 6 лістапада, а затым ад'едзе і іншыя беларускія гарады.**

На думку **протаіерэя Сергія ЛЕПІНА, старшыні Сінадальнага інфармацыйнага аддзела Беларускай праваслаўнай царквы**, супадзенне, што мошчы гэтага святога будуць знаходзіцца ў сталіцы менавіта ў дзень ушанавання яго памяці, дапамагае глыбей адчуць гістарычную сутнасць свята, а разам з тым і сувязь з мноствам мінулых пакаленняў. «Бо наша Царква не толькі жывых, але і памерлых. Царква саборная, і аб'ядноўвае людзей усіх часоў», — лічыць айцец Сергій.

Старшыня Сінадальнага аддзела нагадаў аб гісторыі з'яўлення Дзмітрыеўскай суботы. Дзмітрый Данскі пасля бітвы на Куліковым полі (1380 год) у гонар упакаення ўсіх воінаў, якія загінулі, устанавіў згадваць іх у асобую суботу, якая прыходзілася акурат на суботу перад днём памяці святога Дзімітрыя Салунскага. З цягам часу гэта свята стала настолькі папулярным, што ў гэты дзень пачалі згадваць не толькі аб воінах, якія загінулі, але і аб усіх спачылых.

Правіцу вялікамучаніка Дзімітрыя Салунскага дэлегацыя Эладскай Царквы даставіць у Свята-Духаў кафедральны сабор Мінска, дзе яна будзе знаходзіцца да 14.00 6 лістапада. Сустрэчу мошчаў узначаліць мітрапаліт Мінскі і Заслаўскі Павел, Патрыяршы Экзарх усяе Беларусі. Доступ да святыні будзе адкрыты з 7.00 да 23.00. Пасля сталіцы правіца наведае іншыя гарады Беларусі. У Бабруйску мошчы будуць даступныя для пакланення з 17.00 6 лістапада да 14.00 7 лістапада. Затым — у Полацку, у Спаса-Еўфрасіннеўскім манастыры з 19.00 7 лістапада да 15.00 8 лістапада. У Віцебску сустрэча мошчаў адбудзецца 8 лістапада ў 19.30 ва Успенскім кафедральным саборы. А 9 лістапада ў 18.30 святыню даставяць у Оршу, дзе яна будзе знаходзіцца да 12.00 10 лістапада.

**Вераніка ПУСТАВІТ.** *pustavit@zviazda.by*

## Информация о проведении аукциона с условием по продаже права заключения договора аренды земельного участка

| ЛОТ | |
|---|---|
| Адрес объекта и его наименование | Земельный участок для строительства и обслуживания станции технического обслуживания автомобилей с автомоечным комплексом в к.п. Нарочь (район рынка), площадь — 0,4350 га (кадастровый номер 624056300001000443). **Срок аренды 50 (пятьдесят) лет. Начальная цена 24 888 белорусских рублей 21 копейка.** Шаг аукциона в размере 5% от предыдущей цены |
| Условия, предусмотренные в решении об изъятии земельного участка для проведения аукциона и предоставлении победителю аукциона либо единственному участнику несостоявшегося аукциона | До осуществления государственной регистрации земельного участка и возникновения прав на него возместить в установленном порядке потери сельскохозяйственного производства в сумме 5953 белорусских рубля 39 копеек, перечислив средства на их возмещение на счет по учету средств республиканского бюджета, открытый Главному управлению Министерства финансов Республики Беларусь по г. Минску №3602916010009 в открытом акционерном обществе «Сберегательный банк «Беларусбанк», код банка 795, УНП 600003368, код платежа 05201;<br>заключить с Мядельским районным исполнительным комитетом договор аренды земельного участка и в течение двух месяцев со дня подписания договора аренды осуществить государственную регистрацию земельного участка, прав, ограничений (обременений) прав на него в Мядельском бюро Молодечненского филиала республиканского унитарного предприятия «Минское областное агентство по государственной регистрации и земельному кадастру»;<br>в месячный срок заключить с коммунальным дочерним унитарным предприятием «Управление капитального строительства Мядельского района» договор подряда на подготовку разрешительной документации на строительство станции технического обслуживания автомобилей с автомоечным комплексом в составе согласно подпункта 4.2 пункта 4 Положения о порядке подготовки и выдачи разрешительной документации на строительство объекта, утвержденного постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 20 февраля 2007 г. №223 «О некоторых мерах по совершенствованию архитектурной и строительной деятельности»;<br>разработать в соответствии с разрешительной документацией на строительство проектную документацию на строительство объекта в сроки, не превышающие один год;<br>приступить к занятию (освоению) земельного участка не позднее шести месяцев со дня утверждения в установленном порядке проектной документации на строительство станции технического обслуживания автомобилей с автомоечным комплексом;<br>завершить строительство станции технического обслуживания автомобилей с автомоечным комплексом в сроки, определенные проектной документацией |
| Характеристика расположенных на земельном участке инженерных коммуникаций и сооружений | Асфальтированный подъезд |
| Информация о затратах на организацию и проведение аукциона | Всего 2332 р. 03 к., в том числе:<br>формирование земельного участка – 1106 р. 94 к.;<br>изготовление градостроительного паспорта земельного участка – 924 р. 49 к.;<br>государственная регистрация земельного участка – 63 р.;<br>стоимость извещения о проведении аукциона – 237,60 к. |
| Порядок оплаты | Оплата в размере цены продажи объекта (за вычетом задатка) в течение 10-ти рабочих дней со дня утверждения в установленном порядке протокола о результатах аукциона (часть платы – в случае предоставления рассрочки ее внесения в установленном порядке).<br>Победитель аукциона либо единственный участник несостоявшегося аукциона возмещает расходы, связанные с проведением аукциона и формированием земельного участка, в том числе с государственной регистрацией в отношении создания земельного участка, изготовлением градостроительного паспорта земельного участка и публикацией объявлений об аукционе в средствах массовой информации, с потерями сельскохозяйственного производства |
| Порядок осмотра земельного участка на местности | В рабочие дни с $8^{00}$ до $13^{00}$ и с $14^{00}$ до $17^{00}$ |
| Условия проведения аукциона | Наличие не менее двух участников |
| Продавец | Мядельский районный исполнительный комитет |
| Организатор аукциона | Мядельский районный исполнительный комитет. УНП 600097278. |
| Документы, предоставляемые для участия в аукционе | Заверенную банком копию платежного документа, подтверждающего внесение задатка, паспорт или иной документ, удостоверяющий личность, для юридического лица — копия свидетельства о государственной регистрации. Сумма задатка: 10% от начальной цены на р/с 3600623001906 ЦБУ №619 филиала №601 ОАО «АСБ Беларусбанк» г. Молодечно, код 769, УНП 600537220. Получатель платежа: Главное управление МФ РБ по Минской области, код платежа 04002 |
| Конечный срок и адрес приема заявок | 2 декабря 2016 г., до 16.00, г. Мядель, пл. Ленина, 1, каб. 14, Мядельский районный исполнительный комитет,<br>тел. (факс) (8-01797) 55-5-73, (8-1797) 55-4-00 |
| Дата, время и место проведения аукциона | 7 декабря 2016 г. в 12.00, г. Мядель, пл. Ленина, 1, каб. 36, Мядельский районный исполнительный комитет |

## ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ АУКЦИОНА

**Могилевский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки» сообщает о проведении торгов в виде открытого аукциона по продаже недвижимого имущества, на которое обращено взыскание в счет неисполненного налогового обязательства**

| ЛОТ№1: **Капитальное строение с инв.№ 700/С-52266 – Магазин № 4**, расположенное по адресу: г. Могилев, ул. Гришина, 4, общ. пл. 96,7 кв. м., фундамент– кирпичный, стены –сборно-щитовые, облицованы кирпичом, перекрытия – деревянные, кровля – шифер.<br>Сведения о земельном участке: земельный участок с кадастровым номером 740100000002004043, площадью – 0,0189 га, назначение – земельный участок для использования под здание магазина.<br>**Начальная цена продажи 96 785,10 рублей в денежных знаках образца 2009 г.**<br>967 851 000 рублей в денежных знаках образца 2000 г.<br>Сумма задатка 9 678,51 рубля в ден. знаках образца 2009 г. или 96 785 100 рублей в ден. знаках образца 2000 г. | |
|---|---|
| **Расчетный счет для перечисления задатка** | Получатель платежа РУП «Институт недвижимости и оценки», УНП 190055182,<br>р/с 3012154337010 в ОАО «БПС-Сбербанк», ЦБУ № 703 г. Минск, МФО 153001369 |
| **Дата, время и место проведения аукциона** | **Аукцион проводится 08 декабря 2016 года в 12.00** по адресу: г. Могилев, ул. Первомайская, 99, офис Могилевского филиала РУП «Институт недвижимости и оценки». Последний день подачи заявок и внесения задатка: 06 декабря 2016 года до 15.00 |
| **Срок и условия оплаты приобретенного с аукциона имущества** | В течение 20 (двадцати) рабочих дней с момента подписания протокола аукциона на расчетный счет Организатора аукциона |

Для участия в аукционе участник в установленный срок должен предоставить Организатору:

- заявление на участие в аукционе; - копию платежного документа о перечислении задатка;- паспорт; - индивидуальные предприниматели и юридические лица — резиденты Республики Беларусь — копию документа, подтверждающего государственную регистрацию; -юридические лица — нерезиденты Республики Беларусь — легализованные в установленном порядке копии учредительных документов и выписку из торгового реестра страны происхождения (выписка должна быть произведена не ранее чем за 6 месяцев до даты подачи заявления на участие в аукционе) или эквивалентное доказательство юридического статуса в соответствии с законодательством страны происхождения. Представитель физического лица, индивидуального предпринимателя, юридического лица предоставляет доверенность (документ, подтверждающий полномочия должностного лица).

Аукцион проводится в соответствии с Положением «О порядке учета, хранения, оценки и реализации имущества, изъятого, арестованного или обращенного в доход государства», утв. Указом Президента Республики Беларусь от 19.02.2016 № 63. Победитель аукциона — участник, предложивший наибольшую цену. Условие — наличие не менее 2 участников. Единственный участник имеет право приобрести объект по начальной цене, увеличенной на 5%.

Участник, выигравший торги, возмещает затраты на организацию и проведение аукциона в соответствии со счет-фактурой, которые подлежат уплате в течение 3 рабочих дней после проведения аукциона.

**Дополнительную информацию можно получить по тел: (8-0222) 32-43-98, (8-0291) 400-394; 8-029-624-26-25**

## ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ОТКРЫТОГО АУКЦИОНА

**Аукцион состоится 12.12.2016 г. в 15.30**
**по адресу: 220030, г. Минск, ул. Кирова, 18, 3-й этаж, пом. 104 (конференц-зал «Консул»).**

## Организатор – республиканское унитарное предприятие «Президент-Отель»

На аукционе выставляется право заключения договора аренды недвижимого имущества:

**ЛОТ 1.** часть помещения № 2, площадью 26,7 кв.м, на первом этаже в здании по ул. Кирова, 18 (литер А 12/бл), в г. Минске; с центральным отоплением, электроснабжением; срок аренды — 3 года; начальная цена продажи — 90,78 руб.; размер задатка — 9,07 руб.; целевое использование - осуществление розничной торговли парфюмерной продукцией, сувенирами; ставка арендной платы за 1 кв.м составляет 3 базовые арендные величины.

**ЛОТ 2.** часть помещения № 2, площадью 14,0 кв.м, на первом этаже в здании по ул. Кирова, 18 (литер А 12/бл), в г. Минске; с центральным отоплением, электроснабжением; срок аренды — 3 года; начальная цена продажи — 47,6 руб.; размер задатка — 4,76 руб.; целевое использование - осуществление розничной торговли парфюмерной продукцией, сувенирами; ставка арендной платы за 1 кв.м составляет 3 базовые арендные величины.

Ремонт помещений (в случае его необходимости) и приведение в соответствие правоустанавливающих документов и технической документации осуществляется арендатором самостоятельно за счет собственных средств без последующего возмещения стоимости работ арендодателем.

**Документы на участие в аукционе принимаются с 08.11.2016г. по 07.12.2016г. с 8.30 до 12.00, с 13.00 до 16.00, по адресу: г. Минск, ул. Кирова 18, к.602. Документы, поданные после 16.00 07.12.2016г., не рассматриваются.**

Для участия в аукционе участник в срок, установленный для приема документов на участие аукционе, перечисляет задаток на р/с № 3012000011054 в ОАО «АСБ Беларусбанк», код банка - 795, УНП 192287408, ОКПО 381798305000, государственное предприятие «Президент-Отель» и предоставляет копию платежного документа; подает заявление на участие в аукционе, заключает соглашение о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона. Помимо указанных документов:

